КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY
ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА
1991 г. / № 3 (1338)
20 студзеня 2018 г.

Ментальнасць краю — у яго краявідах

Віктар Шылко. “Зімовы пейзаж”.

15 студзеня 80-я ўгодкі адсвяткавалі чатыры беларускія вобласці — Віцебская, Магілёўская, Гомельская і Мінская.
Юбілей стаў нагодай для шматлікіх культурных праектаў, што будуць доўжыцца яшчэ не адзін тыдзень. Выстава ў Віцебскім мастацкім музеі, якая адкрыла шэраг святочных падзей у сваёй вобласці, засведчыла, што край, які асацыюецца з імёнамі Пэна, Шагала, Азгура, Шчамялёва, спарадзіў і цэлую плеяду іншых таленавітых творцаў. Без сумневу, адзін з найлепшых спосабаў рэпрэзентаваць родную зямлю — паказаць яе вачыма мастакоў.

Нягледзячы на тое, што нагода для выставы была афіцыйная, афіцыёзу ўдалося пазбегнуць. Сабраўшы 54 работы сарака мастакоў Віцебшчыны, арганізатары паспяхова выявілі калектыўнае несвядомае жыхароў гэтага рэгіёна — і, па ўсёй відавочнасці, беларусаў наогул. “Чалавек з’яўляецца часткай пейзажу”, — так навуковы супрацоўнік музея Алёна Рак адказала на выказанае некаторымі мастакамі шкадаванне, што ў экспазіцыі не стае чалавека.

“Выстава сузіральная” — даў ёй дакладную характарыстыку мастак Уладзімір Вальноў, адзначыўшы таксама і важную асаблівасць беларускай ментальнасці. Што адметна, у цэнтры ўвагі апынуўся не чалавек-працаўнік і нават не столькі лясны гушчар, што было б характэрна, хутчэй за ўсё, для Палесся, колькі роўнядзь воднай прасторы. Сапраўды, край рэк і блакітных азёраў!

Фота Сяргея СЕРАБРО.

Заканчэнне — **на старонцы 2.**

Соцыум

МАСТАЦТВА ТЛУМАЧЫЦЬ НА ПАЛЬЦАХ

"К" даведалася, як ствараецца першы ў краіне музейны відэагід на мове жэстаў

ст. 4 — 5

Экспертыза "К"

У ПАДАРОЖЖА СА ШТАНГЕНЦЫРКУЛЕМ

Хто і навошта робіць мініяцюрныя копіі архітэктурных помнікаў Беларусі?

ст. 7

Погляд з XXI стагоддзя

ФІГУРА, ЗАМРЫ

Піянеры, піянеркі і спартсмены, чыімі фігурамі ўпрыгожвалі гарады ў 1930-1960-я гады, — смецце, якое не шкада, ці не смецце, і ўсё ж такі шкада?

ст. 14

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" ПРАЗ ІНДЫВІДУАЛЬНЫ (63875) І ВЕДАМАСНЫ (638752) ІНДЭКСЫ. / З дапамогай банкаўскай карткі газету можна выпісаць праз інтэрнэт-сэрвіс на сайце "Белпошты" (пункт "Афармленне падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі").

Эшафот, які стаў п’едэсталам

Адзін з сумных юбілеяў гэтага года — 75-годдзе знішчэння карнікамі вёскі Хатынь. З гэтай нагоды вядомы на ўвесь свет мемарыяльны комплекс, які адлюстроўвае трагедыю беларускага народа ў гады вайны, рыхтуе цэлую праграму мерапрыемстваў. А распачала яе прэзентацыя новай скульптуры, якая ўпрыгожыць музейную экспазіцыю.

Ілья СВІРЫН / Фота Сяргея ЖДАНОВІЧА

Твор Паўла Вайніцкага “Няскораная” — не манументальны, а станкавы. Ды і памеры ў яго вельмі камерныя: усяго 43 сантыметры ў вышыню. Як адзначыў дырэктар мемарыяльнага комплексу Артур Зельскі, скульптурны вобраз выдатна дапоўніць экспазіцыю музея, дакладна адпавядаючы яго галоўнаму пасылу:

— Мы заўсёды падкрэсліваем, што “Хатынь” — гэта мемарыял, прысвечаны не толькі спаленым вёскам, але ўсім мірным жыхарам Беларусі, які сталі ахвярамі нацызму. Гэта мемарыял, які ўзнік на месцы жудаснага гвалту — але пры гэтым рашуча выступае супраць гвалту ва ўсіх аспектах. Таму ў нас няма духу ваеншчыны або мілітарызму. Мы імкнёмся данесці да наведвальнікаў, што вайна — вялікае зло, што выглядае яна зусім не пафасна, як многім здаецца, а проста жахліва. Думаецца, скульптурная фігура дзяўчыны — як увасабленне крохкасці і безабароннасці — ідэальна адлюстроўвае гэты лейтматыў нашай экспазіцыі.

Па словах дырэктара мемарыялу, выява не мае канкрэтнага прататыпу — хаця кожны вольны разгледзець у ёй тую ці іншую рэальную асобу: Зою Касмадзям’янскую, Машу Брускіну, Ніну Адзянцову...

— Юнае дзяўчо падобнае да сучаснага падлетка, — распавядае аўтар. — Трохі няскладнага, з вялікімі рукамі і ступакамі. Відавочна, яна зусім не адпавядае нашым звыклым уяўленням пра постаць героя. Жаночы вобраз традыцыйна эксплуатуецца пафасным мастацтвам на ваенную тэму, але мне хацелася б максімальна адысці ад яго канонаў. Тут няма праслаўлення гераізму, гэта выключана свядома. Ёсць маладосць, ёсць, напэўна, страх, але ёсць і нязгода з фатальнымі абставінамі ды смелы ім выклік.

Тым, хто бачыў хроніку часоў акупацыі, сюжэт скульптуры адгадаць нескладана. Дзяўчына са звязанымі за спінай рукамі і таблічкай на грудзях робіць крок наперад — мабыць, апошні ў жыцці. Але ў яе паставе трагізм спалучаецца з велічнасцю.

— Гэта крок у далячынь, крок на эшафот і п’едэстал, — ахарактарызаваў ідэю твора Артур Зельскі. К

Газета КУЛЬТУРА
ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА) Выдаецца з кастрычніка 1991 года.
Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Галоўны рэдактар — Ілья Васільевіч СВІРЫН; **намеснік галоўнага рэдактара** — Вераніка МОЛАКАВА; **адказны сакратар** — Юрый КАРПЕНКА; **рэдактары аддзелаў:** Надзея БУНЦЭВІЧ, Яўген РАГІН; **аглядальнікі рэдакцыі:** Дар’я АМЯЛЬКОВІЧ, Настасся ПАНКРАТАВА, Генадзь СІВОХІН, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ; **спецыяльныя карэспандэнты:** Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, Алег КЛІМАЎ; **карэспандэнт** — Ганна ШАРКО; **фотакарэспандэнт** — Сяргей ЖДАНОВІЧ; **мастацкі рэдактар** — Наталля ОВАД; **карэктар** — Мая ХУТКОВА.
Сайт: **www.kimpress.by.** E-mail: **kultura@tut.by.** Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77, чацвёрты паверх. Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23. Тэлефон-факс: (017) 334 57 41. Рэкламны аддзел: тэл. (017) 286 07 97, 334 57 41.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова “КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА”.
Дырэктар — СЛАБОДЗІЧ Ірына Аляксееўна;
першы намеснік дырэктара — КРУШЫНСКАЯ Людміла Аляксееўна. Прыёмная: (017) 334 57 41.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Чацвёрты паверх. Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.
Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. *Матэрыял на правах рэкламы.
©“Культура”, 2018.
Наклад 4 266. Індэксы 63875, 638752. Рознічны кошт — па дамоўленасці. Падпісана ў друк 19.01.2018 у 19.00. Замова 57. Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства “Выдавецтва “Беларускі Дом друку”. ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

Ментальнасць краю — у яго краявідах

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 1.)

Азёры, рэкі ці нават сажалкі прысутнічаюць у мностве з прадстаўленых на выставе твораў, як жывапісных, так і акварэльных. Большасць работ — менавіта пейзажы, куды радзей сустракаюцца нацюрморты. І ўсе яны перадаюць успрыманне свету з пазіцыі беларуса як “натуральнага чалавека”. У шэрагу карцін панаванне воднай стыхіі выяўляецца ў выглядзе снегу — тэма, упадабаная многімі жывапісцамі Віцебшчыны. Пры гэтым мы бачым тую ж заспакоенасць і сузіральна-медытатыўную роўнядзь “воднай цвердзі”. Стыхіі Зямлі і Вады ўсюды знаходзяцца ў дасканалым саюзе, што абумоўлівае асаблівы настрой карцін — як быццам, сон наяве. Гэта надае творам відавочна пазагістарычны, дакладней нават будзе сказаць — надгістарычны характар.

Калі начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама Генадзь Ягораў гаварыў на адкрыцці выставы пра сувязь пакаленняў мастакоў Віцебшчыны, было зразумела, што, дзякуючы менавіта надгістарычнасці рэгіёна, дзе час ператвараецца ў прастору, такая лучнасць з’яўляецца абсалютна натуральнай.

Цікава, што тэма вады закранутая часам зусім непрадказальным чынам. Адзін з найстарэйшых мастакоў Віцебшчыны Уладзімір Вітко, якога ў сваіх колах называюць “наш Уладзімір Ільіч”, адлюстроўвае складаныя ўмовы пасляваеннага побыту. У падвалы, дзе знаходзіліся майстэрні, падымалася вада, і, калі калегі з Мінска прыходзілі да яго, яны дзівіліся нечаканай сустрэчы з той стыхіяй. Тым не менш, як адзначыў Уладзімір Вітко, ніякія нягоды не маглі парушыць атмасферу высокай духоўнасці і адданасці мастацтву, якая панавала ў тыя часы.

У цэнтры экспазіцыі — палатно мастака Анатоля Толкача “Віцебшчына”, напісанае ў 1970-я гады. Хоць карціна створана з натуры, зыходзячы з яе назвы, для мастака было не так важна падкрэсліваць канкрэтыку месца. Мы бачым вясковы пейзаж, выпісаны вельмі падрабязна. Збоку затаіліся, нібыта схаваліся, два храмы розных канфесій. Нягледзячы на тагачаснае панаванне афіцыйнага атэізму, мастак здолеў выявіць характэрнае для Віцебшчыны суіснаванне і ўзаемапранікненне традыцый, якое спакон веку ўзбагачае нашу культуру. А далей сельская мясцовасць урываецца ў водную роўнядзь прасторы, а на далягляцдзе — спрадвечныя беларускія лясы.

На выставе прадстаўлены творы некалькіх пакаленняў мастакоў. Самы даўні — “Лясная глуш” Антона Каржанеўскага, напісаны ў 1957 годзе. Нават цяжка сказаць, ці выведзе куды-небудзь адзіная сцяжынка, якая робіць рэзкі паварот. Да таго ж, жанчына, што некуды рушыць воддаль, наогул пакідае яе, уступаючы ў невядомасць. Выразнасць аб’ёмнай пластыкі і насычанасць каляровай гамы настолькі моцныя, што літаральна ўцягваюць у прастору карціны. Гэта вечны лес, у якім чалавек заўсёды будзе выпадковасцю і нават недарэчнасцю. Такі лес непадуладны цывілізацыі, і няма сумневаў, што ён перажыве яе.

Гарадскі пейзаж на выставе мы ўбачым вельмі рэдка, і тое ён будзе зусім умоўна гарадскім. У ім адсутнічае індустрыяльны дух. Так, “Зімовы пейзаж” Віктара Шылко дэманструе заснежаную прастору ў ваколіцах ратушы — нават дзіўна, як Віцебск яшчэ не пагрузіўся цалкам у гэтыя бясконцыя снягі. А ў акварэльнай працы Аляксандра Карпана “Восень у старым горадзе” галоўнае — гэта стыхія самой восені з яе вільготнасцю, макроцем і завяданнем прыроды. Разам з ёй таксама вяне і апускаецца ў сон стары Віцебск.

Уладзімір Вітко і Генадзь Ягораў падчас адкрыцця выставы.Фота Георгія КАРЖАНЕЎСКАГА

Усё тое самае тычыцца і іншых гарадоў на палотнах. У карціне “Браслаў” Пятра Шарыпы — хутчэй вясковая, чым гарадскія ваколіца, якая ўваходзіць у прастору воднай стыхіі, абыякавай да асобнага чалавека. А далей раскідваецца бясконцая лясная пушча, таксама да чалавека зусім безадносная. Апошнім збудаваннем, што стаіць на мяжы чалавечай супольнасці і прыроднага асяроддзя, з’яўляецца храм, які ўтрымлівае кампазіцыю ў якасці праекцыі Цэнтра свету.

Паказальна, што адзіная на выставе сапраўды гарадская карціна — “Наваполацк. Сонца над горадам” Фелікса Гумена — падкрэслена эсхаталагічная. Горад, здаецца, згарае знутры ад разлітай у ім палаючай атмасферы, а белы сонечны дыск абсалютна абыякава назірае за змярцвелым, штучным асяроддзем. Рэдкія мінакі паўстаюць у выглядзе чорных самнамбул, у якіх чалавечая прырода ўжо выгарала цалкам. Гэта не знешні апакаліпсіс у выглядзе “кары”, але ўнутраная дэгуманізацыя, якая выяўляе страту чалавекам Боскага духу. І папярэджанне, што ў любы момант свет можа самазнішчыцца і знікнуць, не пакінуўшы следу.

У той самы час на выставе пераважаюць жыццесцвярджальныя вобразы, якія вяртаюць індывіду яго ўнутранае жыццё. Нават назвы карцін некаторых мастакоў гавораць самі за сябе: “Віцебскія далі. Дарога да вёскі” Ісаака Бароўскага альбо “Дарога да роднай хаты” Мікалая Таранды. Іх лейтматыў — аднаўленне ў сабе патэнцыялу “натуральнага чалавека”, існаванне якога неаддзельнае ад арганічнай прасторы нацыянальнай культуры. І, вядома ж, яна асвечана святлом духоўнасці, пра што кажа мноства храмаў на карцінах мастакоў.

Георгій КАРЖАНЕЎСКІ

У хуткім часе наведвальнікі Нясвіжскай рэзідэнцыі Радзівілаў здолеюць убачыць на свае вочы хаця б малюткую частку ўнікальнай калекцыі магнацкага роду. Як паведаміў намеснік дырэктара Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка "Нясвіж" Сяргей Егарэйчанка, заключана папярэдняя дамова з музеем у Кембрыджы, які прадаставіць на дэпазітнае захоўванне з дзясятак узораў зброі і даспехаў. У родныя сцены яны вернуцца толькі часова — тэрмінам прыкладна на чатыры гады. Гэтае пагадненне стала рэальным плёнам мэтанакіраванай работы супрацоўнікаў музея па вывучэнні радзівілаўскіх збораў і знаёмстве з імі беларускай аўдыторыі.

Дзе твой даспех, Радзівіл?

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Сяргей Егарэйчанка — адзін з сёлетніх лаўрэатаў Спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Беларусі дзеячам культуры і мастацтва. Узнагарода, атрыманая за выданне кнігі-альбома "Нясвіж. Палацава-паркавы ансамбль. Збор зброі і даспеха" — вынік доўгай працы па сістэматызацыі, класіфікацыі і пошуку прадметаў адной з калекцый былых уладальнікаў Нясвіжа. У першую чаргу тут варта вылучыць менавіта слова "пошук", бо пра лёс многіх артэфактаў навукоўцы даведаліся толькі нядаўна.

— Уся справа ў тым, што калекцыя даспехаў і зброі Радзівілаў лічылася калісьці адным з самых буйных збораў ва Усходняй Еўропе, — распавёў "К" Сяргей Егарэйчанка. — Яна налічвала сотні, калі не тысячы ўнікальных экспанатаў. На жаль, з такога надзвычайнага багацця на тэрыторыі нашай краіны не засталося амаль нічога. Цяпер гэтыя прадметы знаходзяцца ў музеях і прыватных калекцыях па ўсім свеце.

Па словах суразмоўцы, некалькі гадоў ішла напружаная праца па пошуку прадметаў з калекцыі па ўсім свеце. Як аказалася, большая частка радзівілаўскіх збораў пайшла з малатка на аўкцыёнах Christie's у 1926 і 1927 гадах, а таксама аўкцыёне, арганізаваным Амерыканскай асацыяцыяй мастацтваў у Нью-Ёрку ў 1928 годзе. Тады было прададзена больш як 230 прадметаў, якія трапілі ў музеі ЗША, Вялікабрытаніі, Францыі.

Цяпер, пасля выдання кнігі-альбома "Нясвіж. Палацава-паркавы ансамбль. Збор зброі і даспеха", кожны ахвотны можа ўбачыць тыя багацці, якія ўдалося знайсці, а таксама даведацца, у якіх музеях свету ці прыватных калекцыях знаходзяцца гэтыя скарбы, і ацаніць страты. А магчыма, і прыкласці намаганні для вяртання некаторых прадметаў у Беларусь. На шчасце, зрэдку апошняе ўдаецца зрабіць.

— Напрыклад, адзін арыгінальны даспех Радзівілаў не так даўно вярнуўся ў сцены Нясвіжскага замка, — кажа Сяргей Егарэйчанка. — Упершыню за апошнія 90 гадоў! Таму гэта сапраўдная падзея як для беларускіх навукоўцаў, так і для калектыву музея.

Па яго словах, вернуты даспех Мікалая Крыштофа Радзівіла Сіроткі таксама быў прададзены на аўкцыёне 1926 года. Тады ён трапіў у прыватны збор амерыканскага калекцыянера Джона Хігінса і знаходзіўся ў горадзе Вустэр, штат Масачусетс. Некалькі гадоў таму апякунскі савет калекцыі прыняў рашэнне распрадаць частку прадметаў. На шчасце, туды трапіў і радзівілаўскі даспех.

— Мы хутка зарыентаваліся і змаглі набыць яго на аўкцыёне, — патлумачыў Сяргей Егарэйчанка.

Па словах візаві, праца над пошукам прадметаў з калекцыі Радзівілаў будзе абавязкова працягнута. Справа ў тым, што на аўкцыёнах у 1920-я гады "засвяціўся" 231 прадмет, а інфармацыя знойдзена пакуль толькі недзе пра 140. Таксама шмат артэфактаў было страчана ў 1813 годзе і падчас абедзвюх Сусветных войнаў. Дзе многія прадметы знаходзяцца цяпер, у якіх музеях і краінах, ці можна вярнуць гэтую зброю і даспехі на Радзіму — вось тыя пытанні, якія хвалююць Сяргея Егарэйчанку.

К

"Вянок" у гонар

Усе 14 гадоў пасля смерці Уладзіміра Мулявіна (26 студзеня будзе 15) у Беларускай дзяржаўнай філармоніі працягваецца штогодні праект — "Канцэрт у дзень народзінаў". Ён заўжды праходзіць менавіта 12 студзеня і вызначаецца ўсё новымі "прынашэннямі" Песняру. Да 77-х угодкаў была прымеркаваная цэлая абойма прэм'ер.

Надзея БУНЦЭВІЧ

Першае аддзяленне склала новая дакументальная стужка Уладзіміра Арлова, знятая па замове Міністэрства культуры нашай краіны. Другое — колішняя "песняроўская" праграма "Вянок" на вершы Максіма Багдановіча, адноўленая Нацыянальным акадэмічным народным аркестрам Беларусі імя Іосіфа Жыновіча. А ў антракце і пасля канцэрта ў фае можна было набыць выдадзены ў Маскве кампакт-дыск колішняй аўтарскай рэдакцыі.

Вечарына сталася не проста данінай памяці. На першы план у ёй выйшла не столькі мінулае, колькі мастацкі складнік, адпаведны сучаснасці. Так, менавіта мастацкасцю, а не толькі інфарматыўнасцю вылучаўся згаданы фільм "Пясняр. Сэрцам і думамі". З безлічы фактаграфічных звестак, кіламетраў адзнятых кадраў і ранейшых стужак (а Уладзімір Арлоў здымаў "Песняроў" больш за каго іншага) былі адабраны не проста лепшыя моманты, а тыя, што адпавядалі зададзенай драматургіі.

Карціна падзеленая на асобныя раздзелы з падзагалоўкамі. Дзякуючы добраму мантажу і ўдаламу выкарыстанню разнастайных сродкаў кінавыразнасці, узнікла некалькі лейтматываў — сэнсавых і візуальных. Іх спляценне-скрыжаванне дазволіла пазбегнуць як лінейна-бясформеннай падачы матэрыялу, так і залішняй яе "прадказальнасці", "механічнасці", што часам сустракаецца ў рондападобных канструкцыях. Запомніўся тактоўны погляд аўтара на спрэчкі вакол развалу калектыву, праўдзівая французская прэамбула амерыканскіх гастроляў, рубрыка "Невядомы Мулявін", кадры, прысвечаныя мулявінскаму гумару. Па-мастацку афармлена падача шматлікіх фотаздымкаў. І асабліва ўразіў новы пункт гледжання на асобу і творчасць Песняра праз уласна царкоўныя традыцыі.

Заканчэнне — **на старонцы 9.**

Страта

Бязмерныя берагі эпохі Юрыя Васільева

18 студзеня 2018 года пайшоў з жыцця выбітны фатограф, педагог, грамадскі дзеяч Юрый Сяргеевіч Васільеў. Адзін з заснавальнікаў і знакавых асобаў фотаклуба "Мінск". Мастацкі кіраўнік галерэі "Свет фатаграфіі". Ганаровы сябра Беларускага аб'яднання фатографаў. Заслужаны работнік культуры Рэспублікі Беларусь. Сябра рэдкалегіі газеты "Культура".

Фота Алены ШАЛІМА

Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ

Юрый Сяргеевіч з'яўляўся фігурай, якая аб'ядноўвала ўсе пакаленні фатографаў. Яго аўтарытэт быў непахісным, бо ў сваёй постаці ён спалучаў майстэрства фатографа, ключавыя якасці лідара, педагога, інтэлігентнасць і адкрытасць адукаванага чалавека.

У першую чаргу Юрый Сяргеевіч пазіцыяніраваў сябе як грамадскі дзеяч. Бо менавіта на яго рахунку былі такія выбітныя з'явы, як праект "Выстава фатаграфікі ў Мінску" (1971 — 1989), што прагучаў на ўвесь Савецкі Саюз, склаўшы славу савецкай беларускай фатаграфіі; цыкл перадач "Фотапанарама" на Беларускім тэлебачанні ў 1970-х гадах, плённая педагагічная дзейнасць, кураторства галерэі "Свет фатаграфіі", несупынная даследчая праца, прамоцыя беларускай фатаграфіі... Ён паклаў справе папулярызацыі фота ўсё сваё жыццё. Адным з яго памкненняў было стварэнне Музея фатаграфіі ў Мінску. На жаль, гэтай мары мастака так і не ўдалося ажыццявіцца.

Юрый Сяргеевіч палымяна пісаў пра фатаграфію — толькі пазалетась з яго ўдзелам у газеце "Культура" была адкрыта рубрыка — "Беларуская фатаграфія. Імёны". Ён не толькі распавядаў пра здымкі, але і збіраў іх — быў уладальнікам адной з найцікавейшых калекцый работ выбітных фатографаў Савецкага Саюза.

Грамадская дзейнасць ніяк не паўплывала на яго тонкае пачуццё мастака. Працы Юрыя Сяргеевіча вылучаюцца вялікай фатаграфічнай культурай, сузіральнай інтанацыяй і глыбінёй. Яны простыя і зразумелыя, аднак напоўнены сэнсам, пачуццём, прыгажосцю. Тым, што можна назваць праўдай. Жыццё. Чалавека.

Шырока вядомая серыя Юрыя Васільева — "Кіжы" 1972 года. Але, акрамя старых прац, мне хочацца ўзгадаць адну з яго апошніх серый — "Берагі", якая цалкам пацвердзіла творчую форму майстра, прадэманстравала яго талент тонкага назіральніка і мастака.

Успамінаюцца словы фатографа, якія ён казаў у дачыненні да свайго сябра і паплечніка Яўгена Казюлі: "Яўген Карпавіч сабой эпоху і прыкрыў". На маю думку, яны цалкам справядлівыя і ў адрас самога Юрыя Сяргеевіча. Ён стаў фігурай, якая аб'яднала ўсе пакаленні фатаграфіі, захавала эпоху і перадала досвед пра яе свайму атачэнню і паслядоўнікам.

К

Калектыў рэдакцыі "К" глыбока смуткуе з прычыны сыходу майстра і выказвае свае шчырыя спачуванні родным, блізкім і калегам фатографа.



Андрэй Ігнаценка, Антон Шашура і Аляксандра Карніенка абмяркоўваюць дакладнасць жэставага перакладу.

Мастацтва тлумачыць на пальцах

“К” даведалася, як ствараецца першы ў краіне музейны відэагід на мове жэстаў

У кастрычніку 2016 года Беларусь ратыфікавала прынятую Генеральнай Асамблеяй ААН дзесяцігоддзем раней Канвенцыю аб правах людзей з інваліднасцю. Гэта значна актывіравала інклюзіўныя праекты ў розных прафесійных галінах. У культурнай у тым ліку. Але яшчэ да падпісання дакумента Нацыянальны мастацкі музей Беларусі адным з першых у краіне распачаў дзейнасць у гэтым кірунку.

Вераніка МОЛАКАВА / Фота Сяргея ЖДАНОВІЧА

МУЗЕЙ — МЕСЦА ДЛЯ ЎСІХ

Спачатку былі разавыя мерапрыемствы — экскурсіі для інвалідаў-вазочнікаў, дзіцячыя выставы невідушчых мастакоў. У 2014 годзе ў адной з залаў музея з’явіліся тактыльныя копіі нацюрморта “Фрукты” Івана Хруцкага і пейзажа “Зімовы сон” Вітольда Бялыніцкага-Бірулі — выкананыя з фаянсу і пап’е-машэ спецыяльна для таго, каб іх можна было ўспрымаць навобмацак. Гэта быў пачатак пастаяннай экспазіцыі пад назвай “Мастацтва на кончыках пальцаў” — яе сталі фарміраваць для наведвальнікаў, якія не могуць бачыць экспанаты. Пазней адмысловую выставу дапоўніла яшчэ карціна Язэпа Драздовіча і дзве скульптуры Андрэя Асташова, да якіх таксама можна і нават трэба дакранацца.

Побач з кожным творам ёсць стойка з навушнікамі. Націскаеш кнопку — уключаецца трохвілінны аўдыязапіс. Так, пакуль абмацваеш скульптуру ці карціну, пра яе можна яшчэ і паслухаць дадатковую інфармацыю. А напрыканцы 2016 года музей запусціў аўдыёгід з апісаннем 25 твораў са сваёй калекцыі для невідушчых аматараў мастацтва.

У лютым у музеі мусяць з'явіцца яшчэ тры тактыльныя копіі твораў Юдэля Пэна, Язэпа Драздовіча і Івана Хруцкага, якія рыхтуе творчая група "Мівія" (кіраўнік Людміла Скрадаль).

— Усё гэта вялікі крок у развіцці нашай дзейнасці, — адзначае вядучы навуковы супрацоўнік Наталля Сяліцкая. — Мы пастаянна імкнемся да таго, каб музей стаў безбар’ерным асяродкам для кожнага з наведвальнікаў. Месцам для ўсіх.

Зараз там ідзе праца над стварэннем відэагіда на мове жэстаў. І гэта першы вопыт такога кшталту ў музейнай прасторы Беларусі. “К” даведалася, што гэта будзе, каму патрэбна, кім робіцца і калі запрацуе.

ШТО ГЭТА БУДЗЕ?

У выніку ўсё мусіць адбывацца так. Чалавек, які мае праблемы са слыхам, прыходзіць у музей, бясплатна набывае квіток і атрымлівае на касе планшэт, на які запісаны відэафайлы. Нумары запісаў адпавядаюць лічбам пад пэўнымі карцінамі і скульптурамі, пазначанымі спецыяльным сімвалам. То бок там, дзе наведвальнік бачыць значок, ён можа спыніцца і ўключыць відэа на планшэце. На экране ён убачыць экскурсавода, які расказвае пра музейныя экспанаты на мове жэстаў, а ўнізе бягучым радком дадаткова пракручваюцца субцітры з тэкставай расшыфроўкай сурдаперакладу. Натуральна, запіс у любы момант можна спыніць ці паўтарыць яшчэ некалькі разоў.

КАЛІ ГЭТА ЗАПРАЦУЕ?

Вышэй апісана ідэальная сітуацыя, якой у любым разе папярэднічае шмат працы. Спачатку абіраюцца экспанаты, якія могуць быць уключаныя ў экскурсію. Потым тэкставае апісанне да іх рыхтуе мастацтвазнаўца. Спецыялісты па сурдаперакладзе адаптуюць тэкст з улікам асаблівасцей мовы жэстаў. Пасля чаго з ім знаёмяцца непасрэдна носьбіты гэтай мовы. Яны яго вывучаюць, рэдагуюць і ў прамым сэнсе слова сваімі рукамі запісваюць пераклад на камеру. Здымкі экскурсійных відэаролікаў займаюць шмат часу — гэта бясконцыя дублі, папраўкі, пошукі адпаведных музейнай тэматыцы словаў і жэстаў. Затым рыхтуюцца субцітры. Потым папярэдні вынік гэтай працы тэсціруецца на людзях, якія размаўляюць на мове жэстаў. А ўжо затым канчатковая версія запісваецца на планшэты, якія можна выдаваць наведвальнікам.

Для запуску першай экскурсіі ў музеі плануюць зрабіць сурдапераклад апісанняў да пятнаццаці карцін. Праца над гэтым вядзецца з красавіка 2017 года. Гатовых запісаў ужо некалькі: да “Партызанскай Мадонны” Міхаіла Савіцкага, “Сёння свята” Георгія Скрыпнічэнкі, партрэта Міхала Казіміра Агінскага Ганны Разіны Лішэўскай, “Мой горад старажытны, малады” Мая Данцыга, “Давер Аляксандра Македонскага да ўрача Філіпа” Генрыха Семірадскага і іншых. У распрацоўцы яшчэ апісанне вядомых шэдэўраў музея — палотнаў Івана Шышкіна, Васіля Пукірава, Валянціна Волкава, японскага кімано, Беларускай Царскай брамы XVII стагоддзя і іншых. Відэагід для глухіх наведвальнікаў музей плануе запусціць цягам 2018 года.

ХТО ГЭТА РОБІЦЬ?

Нацыянальны мастацкі музей вядзе праект сумесна з Інстытутам інклюзіўнай адукацыі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, то бок над стварэннем першага ў краіне відэагіда на мове жэстаў шчыруюць мастацтвазнаўцы, сурдаперакладчыкі і ўласна носьбіты мовы жэстаў з мастацкай адукацыяй.

— Пасля працы над экскурсіяй для невідушчых наведвальнікаў мы падумалі, што падобнае магчыма зрабіць і для глухіх людзей, але нам патрэбна дапамога, — расказвае вядучы навуковы супрацоўнік Нацыянальнага мастацкага музея Надзея Усава. — Мы шукалі сурдаперакладчыка, які мог бы перакласці на мову жэстаў экскурсію, па некалькіх крытэрыях. Паколькі патрэбны відэагід, то перакладчык мусіць быць абаяльны, пажадана малады і, натуральна, з добрым веданнем мовы жэстаў. Высокаадукаваны — усё ж такі, у нас асаблівая спецыфіка, трэба валодаць тэмай.

Дзякуючы працы над стварэннем відэагіда на мове жэстаў, мастакі Андрэй Ігнаценка (на фота), Аляксандр Пакаціла і Марыянна Чэкелёва атрымалі магчымасць правесці ўвесну сваю першую выставу ў Нацыянальным мастацкім музеі.

У працэсе пошуку музейшчыкам параілі звярнуцца ў Інстытут інклюзіўнай адукацыі да выкладчыка з кафедры сурдапедагогікі Ірыны Русаковіч.

— Мне падаецца, што вельмі важна, каб тэксты на камеру запісваў не адзін чалавек, а розныя людзі, і лепш носьбіты мовы, якія і самі цікавяцца тэмай экскурсіі. Сярод маіх выпускнікоў, з якімі я працавала ў школе для дзяцей з парушэннямі слыху № 14, ёсць мастакі — Андрэй Ігнаценка, Марыянна Чэкелёва, Аляксандр Пакаціла.

Андрэй Ігнаценка — малады жывапісец, які вучыцца на трэцім курсе Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Яго ж мы бачым у якасці аднаго з гідаў на відэа, якое глядзім разам з будучымі вэб-дызайнерамі Аляксандрай Карніенка і Антонам Шашурам.

— Гэта было вельмі цікава і карысна. Мне як мастаку ўдвая, — перадае Ірына словы хлопца пра ўражанні ад супрацоўніцтва з музеем. — Вопыт каласальны — вельмі складана спалучыць у перакладзе мову жэстаў і мову гукаў.

Аляксандра з Антонам вядуць з Андрэем пара-

лельны дыялог жэстамі — абменьваюцца меркаваннямі, наколькі зразумела апісана карціна Андрэя Задорына "Вандроўнік".

— Саша цікавіцца, колькі агулам у музеі карцін, — перадае Ірына пытанне Надзеі Міхайлаўне. — Каля тысячы. — І да ўсіх будзе такі пераклад?

На жаль, адказаць "Так!" у дадзеным выпадку немагчыма. І справа нават не толькі ў тым, што ўсе працуюць на валанцёрскіх асновах. На тое, каб перавесці на мову жэстаў інфармацыю пра ўсе творы, сышло б некалькі гадоў.

— Спачатку ўдзельнікі праекта прайшліся па музейных залах і выбралі каля пяцідзесяці карцін і скульптур, але і такую колькасць хутка адолець немагчыма, — кажа Надзея Усава, якая рыхтавала тэкставыя апісанні да экспанатаў з пункту гледжання мастацтвазнаўства.

— Для глухіх важна і відовішчнасць карціны, і гісторыя яе паходжання, уяўленне працэсу стварэння, разуменне сэнсу, закладзенага мастаком, — тлумачыць Ірына Русаковіч. — Хто, што і чаму — такі мусіць быць лагічны ланцужок у апісанні працы. Каб выбудаваць яго, спачатку тэксты чыталі мы разам з выкладчыкамі Інстытута інклюзіўнай адукацыі, якія спецыялізуюцца па методыцы навучання чытанню глухіх. Бо любы літаратурны тэкст адаптуецца да сурдаперакладу. Спачатку выбіраецца найбольш істотная інфармацыя, прыбіраюцца ўсе мудрагелістыя фразы, якія маюць падвойны сэнс. Жэставы пераклад падмацоўваецца субцітрамі, каб тэкставую інфармацыю можна было параўнаць з візуальным шэрагам, але не ўсім глухім лёгка іх чытаць — мовы гукаў і жэстаў абсалютна розныя па структуры.

— З гэтай жа прычыны шмат часу сыходзіла на тое, каб да тэкстаў падабраць адпаведныя жэсты, — далучаецца да размовы Ірына Радзевіч — вядучы інструктар-перакладчык Беларускага таварыства глухіх. — Каб не згубіць сэнс, падабраць выразныя сродкі, зберагчы неабходную структуру. Мы паставілі такую задачу, каб па стылістыцы расповед пра карціну не нагадваў лекцыю — хацелі, каб у наведвальніка было ўражанне, што хтосьці проста і па-сяброўску дзеліцца з ім тым, што сам ведае. Але запісаць на камеру гэта складана.

— Сам ролік ідзе чатыры хвіліны. Каб запісаць для яго матэрыял, патрэбна працаваць шэсць-сем гадзін, — адзначае Андрэй. — Гэта не так лёгка, як падаецца. Ёсць памылкі, брак, робіцца шмат дубляў. Той, хто здымае, можа згубіць усялякае цярпенне. З вопытам будзе прасцей. Пакуль толькі намацваем, як гэта рабіць.

— Мы вядзем пошук выразных сродкаў рускай жэставай мовы. У нас жа няма слоўніка па выяўленчым мастацтве — фактычна ствараем яго ў працэсе працы, калі сустракаюцца розныя тэрміны — абстракцыянізм, авангардызм, сюррэалізм і гэтак далей, — дадае Ірына Русаковіч.

— Хочам для пачатку зрабіць экскурсію на пятнаццаць карцін — гэтага дастаткова для аднаго наведвання музея, — тлумачыць Надзея Міхайлаўна. — І гэта можа ўжо запаліць нейкую іскру цікавасці. Хаця мы будзем працягваць працаваць і далей — штосьці выкладваць на сайт, павялічваць колькасць аб'ектаў для відэагіда ў музейных залах.

НАВОШТА ГЭТА ПАТРЭБНА?

Па дадзеных Беларускага абласнога таварыства глухіх, толькі ў Мінску людзей, якія маюць праблемы са слыхам, адзінаццаць тысяч. І кожны з іх мог бы пайсці ў музей.

— Натуральна, усё залежыць ад таго, чым цікавіцца чалавек, — разважае Аляксандра Карніенка. — Мы бываем у музеях. Для нас такія паходы — крыніца новых уражанняў і ідэй. Відэагід на мове жэстаў зрабіў бы ўсё гэта яшчэ больш цікавым і карысным. Нам складана карыстацца, напрыклад, інтэрнэт-крыніцамі — там ідзе суцэльны грувасткі тэкст з рознымі тэрмінамі. Патрабуецца шмат часу, каб разабрацца ў ім. Прасцей, калі інфармацыя адаптавана.

— У любым выпадку такія экскурсіі — гэта выдатная магчымасць атрымаць новы вопыт, штосьці даведацца, — лічыць Андрэй Ігнаценка. — І ты ні ад каго не залежыш — узяў планшэт і пайшоў. У праекта вялікая пазнавальная місія. Гэта не толькі папулярызацыя мастацтва, а яшчэ і развіццё свайго слоўніка жэстаў. Асабіста для мяне ўсё, што звязана з мастацтвам, з'яўляецца тым, чым я жыву, у чым бачу сваю будучыню.

— Гэта толькі пачатак. Галоўнае, распрацаваць методыку, — упэўнена Надзея Усава. — Мы ж рабілі ўсё з нуля, рабілі адкрыццё за адкрыццём, разважаючы, што трэба ўлічыць — у што апрануцца, на якім фоне здымаць рукі экскурсавода, каб жэст прачытаўся, наколькі доўгім павінен быць інфармацыйны блок. Ірына Кузьмінічна ўжо апублікавала навуковы артыкул, дзе апісала наш першы вопыт. І ў Беларусі шмат людзей, якім трэба яго перадаваць.

К

Так атрымалася, што адно з першых у маім жыцці інтэрв'ю было з Пятром Юрчанковым-старэйшым. Пётр Пятровіч падараваў мне, тады яшчэ зялёнай журналістцы, вялізную паўтарагадзінную гутарку, якая проста зацягнула мяне ў кіно і тэатр, ды пакінула штосьці такое ў душы, што нават з часам патлумачыць нельга.
Так здарылася і ў дачыненні сына Пятра Пятровіча — Пеці Юрчанкова-малодшага. Мы пазнаёміліся — і адразу пасябравалі. Сяброўства адбылося на "золку" нашых кар'ер і трывала нядоўга, але водгук тых душэўных стасункаў захаваўся на ўсё жыццё.

Хочацца, каб ён сыграў яшчэ

Мы пасябравалі ў той час, калі культурнае жыццё абавязкова, па нашых памкненнях маладых творцаў, мусіла было змяніцца. На мяжы стагоддзяў на тэатральныя і кінапляцоўкі прыйшла плеяда маладых акцёраў, выпускнікоў БДАМ. Святлана Кажамякіна, Вольга Фадзеева, Аляксандр Малчанаў, Андрэй Гладкі… Мінск абмяркоўваў ролі Анатоля Ката. Ды і Юрый Жыгамонт, уяўляеце, тады яшчэ працаваў у тэатры… І Пеця. Гэта быў проста выплеск імпэту і харызмы, і ў яго выпадку гаварыць пра акцёрскі темперамент не мае сэнсу. Было відавочна, што ён здолее сыграць усё: ад злачынца да лірычнага героя.

Акцёрская кар'ера Пятра Пятровіча-малодшага пачалася ў пяць гадоў, аднак перш, чым паступіць у Акадэмію мастацтваў, Пеця яшчэ паспеў пабунтарыць — павучыцца на муляра. "Як думаеш, а чаму ты ўсё ж такі абраў акцёрства?" — памятаю сваё, што называецца, "пытанне-агонь". — "Ну, не дурань, напэўна, быў", — смяецца ў адказ ён.

Прызнацца, творчы партрэт майго сябра мне ў поўнай меры стварыць не атрымаецца. Мы не бачыліся апошнія гады, і я не магу пахваліцца актуальнымі ўспамінамі пра яго. Аднак памятаю той запал і душэўны імпэт, калі Пеця толькі пачаў працаваць у тэатры — спачатку быў Купалаўскі, потым Тэатр кінаакцёра. Мы абмяркоўвалі новыя прэм'еры і тое, чаго нам у іх не хапала. "Чаму ніхто не паспрабуе спалучыць тэатр і кіно? — прапаноўваў Пеця. — Экран падчас спектакля мог бы задаваць новае вымярэнне для акцёрскага існавання". Нам шчыра падавалася, што тэатру бракуе эксперыментаў і новых сродкаў. Хацелася "дерзать".

У той час, калі распачаліся здымкі "Павадыра" Аляксандра Яфрэмава, істотна ўзмацніўся градус спадзяванняў на беларускае кіно. Акцёрскі склад — Анатоль Кот, Валерыя Арланава, Пётр Юрчанкоў, Джамал Тэтруашвілі… Песня К. Слукі ў сярэдзіне стужкі, Маскоўскі вакзал у кадры, наіўная, шчырая і нейкая абаяльная гісторыя… падавалася, штосьці зрушылася з мёртвай кропкі. "Першая меладрама за час незалежнай Беларусі, за якую не сорамна", — так яе характарызавалі гледачы. Верылася, што "Павадыр" стане, прабачце за таўталогію, павадыром да новага кіно пра сучаснасць.

Далей была крымінальная драма "Кіднэпінг", дзе айчынныя акцёры іграліразам з расійскімі зоркамі — Аляксандрам Лыкавым і Гошам Куцэнкам. Сёння гэтым нікога не здзівіш, а тады лічылася перспектыўнай калабарацыяй, выхадам на суседні рынак, адкрыццём новых магчымасцей.

Далей — студэнцкая праца Аляксандра Канановіча "Колер кахання", дзе Пеця мужна вытрымаў усе колеравыя пераўвасабленні. На яе паказе рагатаў нават Андрэй Расінскі — кінакрытык, якога не назавеш вялікім прыхільнікам камедыйнага жанру. Гэта быў ток новых сіл і імпэту, выпуск маладых рэжысёраў курса Міхаіла Пташука. Мусіла нарадзіцца штосьці новае.

"Дунечка", "Рыфмуецца з каханнем", "Маёр Ветраў", "Вольф Месінг", "Шукаю цябе", "Сляды апосталаў"…

Уваход нашага пакалення ў прафесію прайшоў свой узлёт спадзяванняў і прызямлення на рэальную глебу. Прыстойных праектаў станавілася ўсё меней, серыялаў усё болей. Тое, што тады падавалася прарывам, — сёння ўжо часам пастка. Тым не менш, Пеця выкарыстоўваў магчымасці, здымаўся дзе мог.

Калі мы сустрэліся з ім апошнім разам, гэта была прэзентацыя стужкі "Сляды на вадзе" Аляксандра Анісімава, у якой ён сыграў галоўную ролю. Для кагосьці, напэўна, відавочны поспех — буйная праца, фільм айчыннай кінастудыі з прыстойнай — выключна беларускай — акцёрскай камандай. Складаны персанаж. Аднак чамусьці мне было сумна— як быццам, хвалімся мы тым, што ўжо праходзілі.

На маю думку, Пеці так і не ўдалося сустрэць "свайго" рэжысёра, які дазволіў бы яго тэмпераменту і творчаму нерву знайсці тую самую — найлепшую яго ролю. Хаця, вядома, за гэты час акцёрскіх прац было дастаткова. Ды асабліва любілі яго гледачы сцены Тэатра кінаакцёра, якой ён аддаў 16 гадоў.

Для мяне Пётр Юрчанкоў — гэта неверагодная чалавечая адкрытасць, мужчынская харызма, шалёны драйв…. Гэта і душэўны неспакой, які вылучаецца ва ўнутраным пошуку і жаданні спасцігаць, рабіць, выходзіць за межы прапанаванага. Пеці заўжды было шмат — і, магчыма, гэта яго не зберагло.

41 год — проста неверагодна мала! Хочацца, каб сыграў яшчэ, прагучаў, быў уганараваны… Так крыўдна, што так мала магчымасцяў даецца нашым акцёрам і нашаму кіно! Так страшна, што разам з таленавітымі людзьмі сыходзяць і наша маладосць ды спадзевы… Так балюча пісаць успаміны пра сяброў, няхай і далёкіх, якія сыходзяць…

Пеця, выбачай, што апошнім часам так і не атрымалася пагаварыць.

Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ

На маю думку

Фэст на хвалу Божую

Аляксандр ВІСЛАЎСКІ,
спявак, аўтар песень, мультыінструменталіст, выкладчык вакалу і джазавага фартэпіяна

У Беларусі ладзіцца нямала розных імпрэзаў, што спалучаюць культуру і хрысціянства — у тым ліку, і прадстаўнічы міжнародны фэст духоўнай музыкі "Магутны Божа". Але такія форумы арыентаваны на адзін від мастацтва, іншыя там калі і прадстаўлены, дык мала і вельмі выбарачна. На мой погляд, наспеў час аб'яднаць на роўных правах лепшыя ўзоры самых розных відаў і жанраў — музычнага, танцавальнага, выяўленчага, кіно- і тэатральнага — у рамках аднаго буйнога мерапрыемства. Пры гэтым, не ставячы ніякіх канфесійных бар'ераў.

Таму калі мне прапанавалі ўзначаліць міжканфесійны Фестываль хрысціянскай культуры Беларусі "Будзь праслаўлены, Госпадзе", я з радасцю пагадзіўся. Ён пройдзе 11 — 12 жніўня на адкрытым паветры — у цудоўным парку аграгарадка Беразінскае Маладзечанскага раёна. Праграму складуць класічная, харавая, арганная і сучасная музыка, выступленні танцавальных і тэатральных калектываў, мастацкія выставы. Будзе дэманстравацца і ўнікальная калекцыя Біблій, прадастаўленая прыватным збіральнікам.

Зараз заканчваецца адбор да фестывалю — праглядаюцца артысты розных узростаў (пачынаючы ад маленькіх дзяцей і заканчваючы людзьмі сталымі), выбіраюцца мастацкія творы. Сярод гасцей мерапрыемства гледачы ўбачаць, напрыклад, Аляксандра Патліса (мяркуецца, што ён стане і вядучым імпрэзы), спявачку з Латвіі Санту Данілевіч, магчыма, Валерыя Дайнэку. Вядуцца перамовы і з тэнарам сусветнага ўзроўню, імя якога агучваць пакуль рана. А ўзначаліць журы пагадзілася Ядвіга Паплаўская.

Так-так, удзельнікі фэсту будуць з'яўляцца і як бы канкурсантамі, але судзіць іх будуць вельмі мякка: месцаў ніякіх прысуджаць не стануць і без узнагарод — спецыяльных статуэтак — не з'едзе ніхто! Алесь Камоцкі піша для форуму гімн, а ў лютым яго ўвасобяць у кліпе — песню выканаюць некаторыя ўдзельнікі фэсту. Па задумцы павінна атрымацца нешта накшталт знакамітага нумара We Are the World. Дарэчы, на фестывалі выступіць камерны хор, рэпертуар якога складуць музычныя творы, прыналежныя да розных канфесій, прычым аранжыроўкі іх будуць вытрыманы ў сучасным духу — прыблізаваным, прыджазаваным. Кіраваць калектывам даручылі таксама мне.

Мы загадзя імкнёмся вырашыць і хваравітыя для падобных фэстаў пытанні інфраструктуры: камфортнае размяшчэнне ўдзельнікаў, гасцей, гледачоў, кавярні, біяпрыбіральні... Радуе і ўвага СМІ, якая праяўляецца да фэсту ўжо сёння. Фіксаваць імпрэзу на камеры будуць тры тэлевізійныя кампаніі — з Беларусі (адзін з цэнтральных каналаў), Ізраіля і Расіі. Беларускія кінематаграфісты здымуць пра форум дакументальны фільм.

Мне думаецца, што гэты фестываль абавязкова стане яшчэ адной пляцоўкай, з якой Беларусь заявіць усяму свету аб сваёй міралюбнай палітыцы, накіраванай на ўмацаванне дружбы паміж народамі, а ў гэтым канкрэтным выпадку — пра гатоўнасць праз духоўна-культурныя традыцыі і каштоўнасці стаць мастком павагі і талерантнасці, дыялогу і салідарнасці паміж хрысціянамі розных канфесій. Вельмі разлічваю і на тое, што форум выявіць па-сапраўднаму адораных творцаў, якія працуюць у розных відах мастацтва. Праведзены кастынг ужо дазваляе на гэта спадзявацца.

Спадчына як поле для дыскусій

Камяні без сэнсаў, якія мы ў іх укладаем, застаюцца ўсяго толькі камянямі

Генадзь ВОХІН

Напрыканцы мінулага года ў Беларускім камітэце ICOMOS змяніўся старшыня. Нечакана для многіх, айчыннае прадстаўніцтва буйной міжнароднай арганізацыі па ахове спадчыны ўзначаліў даволі малады навуковец Сцяпан СТУРЭЙКА. Ён вядомы сваімі неартадаксальнымі поглядамі на тэорыю і практыку аховы, узнаўлення і актуалізацыі культурных набыткаў. Яго нядаўна выдадзеная кніга "Неспакойныя камяні. 9 эсэ для новага разумення архітэктурнай спадчыны" яскрава іх выяўляе, спараджаючы мноства пытанняў.

— Твая кніга вельмі адрозніваецца ад традыцыйнай навуковай "сухой" манаграфіі. Ды і навукова-папулярнай яе не назавеш. Гэта хутчэй сапраўды зборнік эсэ. Магчыма, нават у нечым і постмадэрновых — з улікам усіх кантэкстуальных змяшчэнняў сэнсаў і гіпертэкстуальных адсылак. Чаму твой погляд на спадчыну набыў менавіта такую форму?

— Па-першае, я лічу яе цікавай і запатрабаванай. Па-другое, як даследчык, я лепей пачуваюся не ў мясцовым, а ў еўрапейскім кантэксце, усяляк імкнучыся выходзіць паза рамкі ўнутрыбеларускасці. Я шмат чытаю пра спадчыну на англійскай мове, на польскай, часам на чэшскай. І мушу адзначыць, што тамтэйшыя сур'ёзныя выданні не падпадаюць пад нашы стандарты акадэмічных тэкстаў. Сучасная заходняя гуманітарыстыка — найперш прастора выказванняў, часам правакацыйных, якія пакліканы не столькі адказваць на пытанні ці асвятляць тэму энцыклапедычна, "ад і да", колькі, наадварот, тыя пытанні паставіць.

Разумееш, галоўная праблема ў абмеркаванні праблематыкі спадчыны — пошук сэнсаў. Тое, пра што я пішу ў кнізе — гэта шмат у чым трансляцыя заходняга досведу разумення спадчыны і пераклад яго на нашу ментальную мову. Часам нам здаецца, што ў іх усё лепш ды інакш — але найперш таму, што яны проста раней пра гэта напісалі. Бо спадчына — гэта ж не камяні, гэта тое, што пра іх напісалі. Гэта — сэнсы! І там яны былі сканструяваныя раней. Таму нам і здаецца, нібы яны наперадзе.

— Такім чынам, пра што ж атрымалася твая кніга, калі яна — не акадэмічны падручнік па рэстаўрацыі? Пра пытанні самому сабе?

— Я пачынаю на гэта адказваць адразу ж ва ўводзінах. Пішу пра тое, што кніга — гэта зварот да пакуль адсутнага. Але верыцца, што менавіта за ім будучыня. Традыцыі такой пастаноўкі праблемы і такога спосабу маўлення пра спадчыну, якую я практыкую, у нас пакуль няма і ў гэтым сэнсе я — шчаслівы чалавек, бо знайшоў штосьці новае. Так, быць першым пачэсна. Адзіная праблема, што акадэмічная дзейнасць складаецца з дыскусіі, з параўнанняў, са спрэчак... Але пакуль я адзіны, дыскутаваць няма з кім. Таму спадзяюся, што хутка гэтае поле нарасце.

— У чым, на тваю думку, асаблівасць беларускай рэстаўрацыі? Ці можна казаць пра яе школу?

— Няма ніякай уласна беларускай спецыфікі ў рэстаўрацыі. Тыя працэсы, якія тут адбываюцца — абсалютна ўсе стандартныя і "мадэльныя". Нічога такога няма ў нас, чаго б не было ва Украіне, Расіі, Польшчы, Чэхіі... Ва ўсіх гэтых краінах рэстаўратары знаходзяцца ў аднолькавых умовах і іх камунікацыйнае поле таксама аднолькавае. Усюды важна, хто робіць, што і з якой матывацыяй. Важна, хто з'яўляецца ўпаўнаважаным прымаць рашэнні і ўплываць на іх, чыё меркаванне прыярытэтнае. І як выбудоўваецца механізм прыняцця гэтых рашэнняў.

Больш за тое, і нашы дасягненні, і заганы — таксама тыповыя. Паглядзім на тую ж Вільню. "Барацьба" за спадчыну з цягам часу спалучыла на адной пляцоўцы і капітальна адрэстаўраваны ў пачатку XIX стагоддзя Кафедральны сабор, і "гіпатэтычную" рэканструкцыю вежы Гедыміна ў Міжваенне, і кансервацыю за савецкімі часамі парэштак Верхняга замка, і цяперашняе "аднаўленне" Ніжняга. Ніхто з аўтараў кожнага з праектаў не мог нават уявіць агульны выгляд атрыманага "ансамбля". Хіба гэта нічога не нагадвае з беларускіх практык?

— Але тут ідзе гаворка пра Усходнюю Еўропу...

— Зразумела, чым далей ад Беларусі, тым больш з'яўляецца пэўнай спецыфікі. Але і гэтыя адрозненні непрынцыповыя. Таму што феномен росту колькасці помнікаў і "бум спадчыны", калі ў апошнія дзесяцігоддзі спісы каштоўнасцяў сталі расці да неверагодных памераў, — гэта новае і для нас, і для Захаду. У іх, магчыма, больш адпрацаваная тэхналогія рэстаўрацыі і прыняцця рашэнняў, але з "бумам спадчыны" мы сутыкнуліся адначасова, і гэта нас ураўноўвае.

— Рэстаўрацыя ў тваёй кнізе выяўляецца пэўнай формай рэцэнзіі на помнік спадчыны. Адпаведна, сама кніга — рэцэнзія на рэцэнзію?

— І ў Беларусі, і ва Усходняй Еўропе, і ў іншых постсацыялістычных краінах мы стаім на такім вітку развіцця рэстаўрацыйнай работы, што ўвесь ранейшы інструментарый абыходжання са спадчынай, "заточаны" пад старыя сэнсы, ужо не спрацоўвае. Грамадства вельмі моцна мяняецца. А спадчына — гэта ж не рэч у сабе, якая месціцца ў вакууме.

Як прыклад — тая ж Каложская царква ў Гродне. Яна — сапраўдны выклік для рэстаўратараў і ўсіх абаронцаў спадчыны. Не столькі на тэхнічным узроўні, колькі менавіта на ўзроўні пошукаў сэнсаў. Пачнем з самага пачатку: як датаваць помнік? Ацалелая "мураваная" частка спрэс складаецца з размаітых фрагментаў, якія былі дададзеныя ў розныя часы. Ці карэктна тады ўзнаўляць храм менавіта на ўзор XII стагоддзя і цалкам забыцца на элементы іншых часоў? Я мяркую, што больш дарэчным было б прызнаць храм сведчаннем 800-гадовай практыкі перабудовы і абнаўлення. Менавіта з гэтага мусіць сыходзіць канцэпцыя яе захавання.

У выніку шматлікіх канфліктаў і спрэчак спадчына пераўтвараецца ў досыць праблемнае поле. Я пішу пра спадчыну як поле камунікацый, але ж насамрэч сёння — гэта поле канфлікту! Так атрымалася, што ў нас асноўны рэжым камунікацый — менавіта рэжым канфлікту.

— Канфлікту каго з кім?

— Усіх, хто лічыць сябе легітымным выказвацца на гэты конт. Канфігурацыі могуць быць вельмі розныя — канфлікт рэстаўратараў з рэстаўратарамі, рэстаўратараў з гісторыкамі, археолагаў з чыноўнікамі, чыноўнікаў з грамадзянскай супольнасцю. Вельмі часта спрэчкі пра спадчыну і яе абарону — перадусім барацьба кампетэнцый: хто + мае большае права прымаць рашэнні адносна нейкага канкрэтнага помніка. Актывісты, даследчыкі, уладныя структуры? Заўсёды ёсць супрацьпастаўленне тэарэтыкаў-ідэалістаў, архітэктараў-праекціроўшчыкаў і прагматыкаў-менеджараў.

І таму тут не абысціся без пастаноўкі глабальных пытанняў. Справа ў тым, што пры больш блізкім поглядзе на пэўныя помнікі — тыя ж Нясвіжскі, Лідскі ці Навагрудскі замкі — можна ўбачыць, што яны ўжо даўно ператварыліся ў "караблі Тэсея", у якіх у выніку перманентных рамонтаў усе часткі былі замененыя на новыя. Пры гэтым кожная такая "рэстаўрацыя" пакідала ўсё менш і менш аўтэнтыкі. Усе, хто выказваецца пра рэстаўрацыю, лічаць яе неабходнай, але яна — і ёсць месцам нараджэння канфлікту. Таму адно з такіх філасофскіх пытанняў — што ж мы ахоўваем і захоўваем? Лічу, без адказу на яго мы не зможам зрабіць наступных хадоў.

— Ці не баішся ты быць абвінавачаным у ментарстве і высакалобым павучанні? Пры тым, што кожны "практык" мог бы цябе ўшчуць: маўляў, а дзе твае ўласныя праекты?

— Не толькі мог бы, але і ўжо "ўшчуваюць". Такія прэтэнзіі былі, ёсць і будуць. У мяне іншая прафесійная ідэнтычнасць — я выступаю як даследчык, як чалавек, якому цікава больш зразумець пра спадчыну. І нічога страшнага, што кніга не дае канкрэтных адказаў — яна пашырае разуменне. Але калі вам не хочацца пашыраць уласнае разуменне — проста не чытайце.

— На вялікі жаль, апошнім часам не вельмі часта чутно пра дзейнасць Беларускага камітэта ICOMOS — за выключэннем хіба штогадовага Фэсту экскурсаводаў, у якім ён выступае суарганізатарам. Але ж я ведаю, што ваша праца гэтым не абмяжоўваецца.

— Сапраўды, пра ICOMOS было мала чуваць, але я не бачу ў гэтым надта вялікую праблему. Бо камітэт — перадусім экспертная арганізацыя, якая і не павінна рабіць гучных заяў. Яна мусіць пазбягаць канфліктаў, прапагандаваць лепшыя практыкі работы са спадчынай і выбудоўваць разуменне таго, якія з іх нам падыходзяць. Такая дзейнасць проста не можа быць гучнай. Але гэта не азначае, што Беларускі камітэт ICOMOS павінен зусім сысці ў падполле. І праекты, якія мы плануем, будуць звязаныя і з рэстаўрацыяй, і са стварэннем музейных экспазіцый, і з работай з мясцовымі супольнасцямі. Тут я буду выступаць у ролі арганізатара, які выбудоўвае камунікацыю паміж рознымі ўдзельнікамі.

— Тады пару словаў пра тваю "выбарчую праграму".

— На з'ездзе, дзе мяне абралі, я агучыў тры прыярытэтныя кірункі развіцця арганізацыі. Папершае, гэта акурат павышэнне пазнавальнасці і бачнасці арганізацыі. Па-другое, работа з рэсурсамі. І тут ідзе гаворка не толькі пра фандрайзінг, хаця і пра гэта таксама. Я маю на ўвазе яшчэ і сацыяльны капітал, пошук партнёраў, выбудову адносін з дзяржаўнымі ўстановамі ў рэгіёнах, з іншымі рэстаўратарамі, з музеямі. Па-трэцяе — тут я ўжо транслюю ўласную ідэнтычнасць, — арганізацыя мусіць стаць агентам новага мыслення пра спадчыну.

Гэта значыць, разуменне таго, што спадчына — нешта большае за проста матэрыяльныя аб'екты, яна не павінна цалкам атаясамлівацца з мінулым, якое заўсёды ў пэўнай меры зміфалагізаванае. Яна — не проста прыгожыя камяні, а пасланне, інфармацыя, якая перадаецца і якая звязаная з цяперашнім больш, чым з гісторыяй. І самае галоўнае: новае мысленне пра спадчыну — гэта разуменне таго, што яна можа быць актуалізаваная, "створаная", ці, наадварот, ёй можа быць "адмоўлена" ў праве на існаванне. Тут усё залежыць ад таго, хто гэтым займаецца.

К

У падарожжа са штангенцыркулем

Хто і навошта робіць мініяцюрныя копіі архітэктурных помнікаў нашай краіны

Год таму ў Беларусі з'явіўся музей копій айчынных архітэктурных славутасцяў "Краіна міні", які ў снежні Міністэрства спорту і турызму прызнала найлепшым стартапам мінулага года. У адным месцы сабраны макеты адметных будынкаў краіны, натхніўшыся якімі, хочацца выправіцца на экскурсію да арыгіналаў. Дакладныя мініяцюрныя копіі Лідскага замка, Брэсцкай крэпасці ды іншых знакамітых аб'ектаў захапляюць не толькі "партрэтным" падабенствам, але і аб'ёмам зробленай карпатлівай работы. Пра тэхнічныя ноу-хау і мастацкую кемлівасць распавёў "К" кіраўнік макетнай майстэрні Inscale, што супрацоўнічае з музеем, Ілья КУЗЬМЕНКА.

Занатавала
Настасся ПАНКРАТАВА /
Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ
і з архіваў майстэрні

Ілья Кузьменка і праекты яго майстэрні: макеты Опернага тэатра, Мірскага замка (да і пасля афарбоўкі) і фігурка будучай гераіні адной з жанравых сцэнак.

МАНАТОННАСЦЬ ТВОРЧАГА ІМПЭТУ

— Як правіла, у макетныя майстэрні прыходзяць па поклічы душы. На макетчыка нідзе не вучаць, прафесійныя навыкі вырастаюць часцей з хатняга захаплення. Хтосьці, адштурхоўваючыся ад дзіцячага хобі, набывае сумежную спецыяльнасць: архітэктара, праекціроўшчыка, дызайнера. У нашай майстэрні, якой па дакументах усяго паўгода, сабраліся аднадумцы, што ведаюць адзін аднаго на працягу гадоў шасці. Нас сем чалавек (напрыклад, над адкрыццём інтэрактыўнага музея "Гранд Макет Расія" ў Санкт-Пецярбургу працавала каля сотні спецыялістаў — **Н.П.**), але больш і не трэба, бо ў нашай сферы куды важней мець напарніка, на якога можна пакласціся, чым вялікую колькасць ненадзейных супрацоўнікаў. Многім падаецца, быццам макетаванне — адно творчая праца. У такіх апантаных часта наступае расчараванне, бо хутка высвятляецца шмат тэхнічных патрабаванняў, а сам працэс пачынае прыгнятаць манатоннасцю.

Пры вялікіх аб'ёмах і кароткіх тэрмінах работы можна скарыстацца і інструментамі аўтсорсінгу. Як кіраўнік разглядаю магчымасць задзейнічаць практыкантаў, студэнтаў Акадэміі мастацтваў, навучэнцаў архітэктурнага каледжа. Для іх ёсць неабмежаванае поле працы. Напрыклад чалавечкі, якіх на некаторых музейных макетах можа быць да тысячы. Скульптар адлівае ў сіліконавых формах постаці, што сядзяць ці стаяць. Пасля на фігурках неабходна "раскрыць" швы і надаць кожнай, як марыянетцы, пэўную позу. Прынамсі, у сюжэце вакол Мірскага замка выкарыстана 250 фігурак, 50 з якіх ляпіліся скульптарам уручную, каб дакладна пабудаваць мізансцэны. На нашым макеце адбываецца канцэрт, дык вось за прототып народнага калектыву быў узяты ансамбль "Бяседа". Усім чалавечкам трэба намаляваць прычоску, касцюм, некаторым — вочы, адметную міміку. Прыкмеціў, што з дадзенай працай лепш спраўляюцца дзяўчаты. Верагодна, даецца ў знакі жаночая цярплівасць і стараннасць.

Макеты для "Краіны міні" робяцца ў розным маштабе. Стандартны для музеяў памер 1:87 не заўсёды падыходзіць з-за абмежавання выставачнай прасторы, што мае музей (памяшканне ў сталічным Палацы культуры прафсаюзаў). Некаторыя аб'екты ў звыклым маштабаванні раскінуліся б амаль на тры метры, таму па кожным заданні даводзіцца змяняць лічбы: можам узвесці гістарычны будынак у памеры 1:156 ці 1:200. Уявіце, якога памеру на такім макеце фігуркі!

ФІГУРКІ МЯНЯЮЦЬ УНАЧЫ

— Кожны праект пачынаецца з сур'ёзнай працы па зборы дакументаў. Лягчэй рабіць сучасныя аб'екты: да іх шмат чарцяжоў, у свабодным доступе выкладзены здымкі з квадракопцера. Напрыклад, пры стварэнні копіі Вялікага тэатра Беларусі мы карысталіся матэрыяламі з дакументальных перадач, адкуль можна даведацца пра неабходныя нам тэхнічныя падрабязнасці.

Са старымі будынкамі не ўсё так адназначна. Некаторыя аб'екты мы вымушаны ўзводзіць па фотаздымках, бо чарцяжоў не захавалася. Даводзіцца звяртацца па дакументы ў бібліятэкі, шукаць калі не чарцяжы, дык тэкставыя дакументы, каб знайсці хаця б апісанне будынку і тэрыторыі побач з ім. Таксама імкнемся шчыльна супрацоўнічаць з айчыннымі музеямі, дасылаем ім запыты. Там заўжды з задавальненнем нам дапамагаюць, бо разумеюць: мы робім адну справу. Але і музейныя архівы не заўсёды даюць адказы на нашы пытанні. Па адным з праектаў, што знаходзіцца ў распрацоўцы, я звязваўся з польскімі знаўцамі.

У нас вельмі патрабавальныя наведвальнікі. Калі ўбачаць на макеце нейкія недарэчнасці, абавязкова адзначаць гэта ў кнізе водгукаў і прапаноў. Часам завітваюць даволі ўедлівыя гісторыкі. Калі заўвага да нас аргументавана, то мы хутка выпраўляем памылку. Была сітуацыя, калі на адным з макетаў тэрмінова мянялі фігуркі ўначы — знайшлі недарэчнасці ў дэталях рыцарскіх даспехаў.

ГАСПАДАРЧАЯ ГУБКА ДЛЯ ГІСТАРЫЧНАЙ АДПАВЕДНАСЦІ

— На падрыхтоўку аднаго макета затрачваецца прыкладна паўтара месяцы. Над ім як мінімум завіхаюцца праекціроўшчык, мастак, электрык, дызайнер, зборшчык. Асноўнае патрабаванне да спецыялістаў: дакладнае веданне свайго матэрыялу. Галоўнае — менавіта архітэктурная праўдападобнасць.

Апошнія некалькі гадоў для спрашчэння працэсу многія карыстаюцца 3D-прынтарамі. Мы ж друкуем у аб'ёме толькі тады, калі ў пэўнага элемента макета няправільная форма (у гэтым выпадку чалавек не зможа ўручную бездакорна вымераць вуглы). Прынамсі, на 3D-прынтары друкавалі каркас вежаў і даху Мірскага замка. Пасля ж кладку з каменняў і цэглы прыклейвалі да сцен па каменьчыку і тынкавалі. Толькі так магчыма было стварыць фактуру сцен.

Мы укладваем у макет душу, склейваючы ўручную сотні фрагментаў. Прынамсі, Вялікі тэатр Беларусі збіраўся з пяці тысяч дэталяў! Макет аблытаны дратамі даўжынёй у 300 метраў — павуцінне электрыкі цягнецца ад кожнай лямпачкі, каб будынак "ажываў у начы". Ад вока наведвальніка пад кожным макетам схаваны міні-камп'ютар.

Мы працуем з дробнымі формамі, таму станкі заказвалі пад сябе. Прынамсі, для вырэзвання тратуарнай пліткі, дэталяў дамкоў выбралі кампактны фрэзер з невялікай сталешніцай. Увогуле, інструменты збіралі з розных прафесійных галін. У нас у майстэрні можна ўбачыць будаўнічыя прылады, шматлікія медыцынскія прыборы: хірургічныя скальпелі, стаматалагічныя кусачкі і фрэзы для бормашыны, зубныя шчоткі і дробныя свердзелы. Шмат неабходнага знаходзілі на барахолках. Напрыклад, савецкі штангенцыркуль — найлепшы для нас вымяральны інструмент.

Частка матэрыялаў набываецца ў гатовым выглядзе, але ў Беларусі многага няма, бо мадэляванне ў нас не так папулярна, як у Еўропе. Таму за травой, агароджамі, пасыпкамі даводзіцца выпраўляцца ў Маскву. Раз-пораз выратоўвае кемлівасць нашых мастакоў: кроны яны робяць са звычайнай гаспадарчай губкі. Падрэзаць, спецыяльным чынам адшліфаваць — і не адрозніш ад фабрычнага матэрыялу. Ствалы дрэў могуць рабіць з натуральных галінак, апрацаваных ад паразітаў. Ім надаюць пэўную форму, пакрываюць лакам, а пасля мацуюць да іх лісце. Дарэчы, шыкоўна для макетаў падыходзіць падрыхтаваны пэўным чынам мох. Як гаворыць наш супрацоўнік Ігар Мінгазаў — вопытны макетчык, на рахунку якога перамогі на еўрапейскіх спаборніцтвах, мы карыстаемся спосабамі, якія добра вядомыя кінематаграфістам ва ўсім свеце, па гэткім жа прынцыпе ствараліся, прынамсі, класічныя "Зорныя войны".

ПРЫВІД СОНЕЧКА І ТЭХНІЧНЫЯ НОУ-ХАУ

— Зразумела, глядзім, што новага з'яўляецца ў іншых макетных майстэрнях, каб ісці ў нагу з калегамі. Прынамсі, актыўна карыстаемся флакатарам — прыборам, які з дапамогай статычнай электрычнасці робіць так, каб кожная варсінка на макеце "глядзела на сонца". З дапамогай электродаў "стрыжэм" газоны. За час існавання музея наша майстэрства вырасла, ужо бачым, што можна дадаць на існуючыя макеты. Прынамсі, у ваеннай сцэне ля Холмскіх варот Брэсцкай крэпасці хутка зможам задзейнічаць сапраўдны дым.

З Расіяй у нас аднолькавая макетная школа, але розныя падыходы. Так, мы вывучалі іх вопыт, але і яны, калі да нас прыедуць, нешта змогуць узяць сабе на заметку. Прынамсі, кожны з макетаў мы забяспечваем асобнай аперацыйнай сістэмай. Яна дазваляе нам нават задзейнічаць у інсталяцыі дробныя экранчыкі, на якія можна выводзіць відэашэраг. Для макета опернага тэатра распрацоўвалі адметны варыянт, як узнімаць адну са сцен будынка, каб паказаць рух унутры тэатра. Зараз модна рабіць інтэрактыўныя кнопкі, націснуўшы на якія, можна запусціць нейкае дзеянне на макеце.

Асаблівасць нашай працы яшчэ ў тым, што канцэпцыю кожнага макета мы ствараем, зыходзячы з праграмы экскурсіі. Часам дазваляем сабе крыху пасвавольнічаць: робім і не зусім навуковыя, але запамінальныя для наведвальнікаў рэчы. Спецыяльна для экскурсавода "пасялілі" ў наш макет Мірскага замка прывід Сонечку. Дух Соф'і Святаполк-Мірскай выкананы са спецыяльнага празрыстага пластыка і свеціцца знутры.

Нам хочацца не толькі зрабіць прыгожую мініяцюру, прадэманстраваць тэхнічныя магчымасці, але і дасягнуць іншай мэты: паказаць людзям, колькі ўсяго цікавага існуе ў Беларусі. Можна не ехаць у замежныя замкі — усё ёсць дома. Дзякуючы бязвізаваму рэжыму ўзрасла турыстычная плынь. Для вандроўнікаў нашы макеты — запамінальная і натхняльная турыстычная карта краіны.

К

Лялькі, што жывуць на “Нябёсах”

Надзея БУНЦЭВІЧ

У нядзелю ў Мінску завяршыўся IV Міжнародны Калядны фестываль батлеечных і лялечных тэатраў “Нябёсы: з лялькай да Бога”. За чатыры дні дзеці і дарослыя змаглі ўбачыць 19 спектакляў з сямі краін свету: Беларусі, Вялікабрытаніі, Германіі, Літвы, Расіі, Украіны, Эстоніі. Гран-пры паехаў у Львоў: яго атрымаў тамтэйшы тэатр “І людзі, і лялькі” за спектакль “Скінія залатая”.

“Умка — белае мядзведзяня” тэатра ProJekt з Эстоніі.

— Фестываль праводзіцца па блаславенні Мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі Паўла, — гаворыць мастацкі кіраўнік праекта Аляксандр Ждановіч, вядомы па шматлікіх ролях у Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Максіма Горкага, на тэлебачанні і ў кіно. — “Нябёсы” маюць і ярка выяўлены дабрачынны аспект: калектывы-ўдзельнікі з радасцю выступаюць не толькі ў нядзельнай школе Свята-Елісавецінскага манастыра, дзе адбываюцца асноўныя фестывальныя падзеі, але і ў Дамах-інтэрнатах. Такія паездкі ладзяць таксама тыя, хто з тых ці іншых прычын не змог патрапіць у асноўную праграму, бо заявак з кожным годам становіцца ўсё больш.

Фестываль развіваецца, і не заўважыць гэта немагчыма. Справа не толькі ў паляпшэнні яго арганізацыі. Да батлейкі ўсё больш актыўна далучаюцца спектаклі, самыя розныя паводле тэматыкі, эстэтыкі, жанраў, выкарыстаных прыёмаў. Летась, да прыкладу, усіх вельмі ўразіў “атмасферны” спектакль з Расіі, перад паказам якога ўсім, начынаючы з членаў журы, завязалі вочы і ў такім стане, узяўшы за руку, праводзілі ў залу, дзе публіка і надалей арыентавалася выключна на слыхавыя, нюхальныя, тактыльныя адчуванні. Сёлета падобных эксперыментаў, разлічаных не толькі на невідушных, але і на нашае з імі паразуменне, не было. Але ў многіх спектаклях узнікалі свае “разыначкі”, прычым даволі часта — за кошт самага разнастайнага сінтэзу. Біблейская гісторыя апыналася “ўнутры” сучаснага аповеду, узмацняючы асветніцкую скіраванасць дзеі. Спалучаліся марыянеткі, пальчаткавыя лялькі, плоскасныя выявы. Тэатр ценяў, панарамны тэатр, “шматпавярховасць” батлеечнай скрыні. Вобраз Смерці, што прыходзіць да цара Ірада, і вясёла-жахлівы макабрычны танец шкілета з сучасных трылераў (“Мішка і Каляды” Тэатрыка Сашы Луняковай з Пушкіна, што атрымаў дыплом “За лепшае раскрыццё духоўна-маральнага зместу спектакля”). Жывы план і праекцыі з тэхнікай эбру, якая ў побыце завецца “маляваннем на вадзе” (сумесная вільнюска-маскоўская “Легенда пра Калядную ружу”). Маскі-каптуры і вынаходлівая работа з тканінай (“Умка — белае мядзведзяня” тэатра ProJekt з Эстоніі, вылучаны “За лепшае выяўленчае рашэнне”).

Гран-пры фестывалю атрымаў спектакль “Скінія залатая” львоўскага тэатра “І людзі, і лялькі”.

— На сёлетнім фестывалі было менш батлеечных спектакляў, каляднай тэматыкі, але агульны ўзровень узрос, — сведчыць член журы, тэатразнаўца Кацярына Яроміна. — Гэта адбылося не толькі таму, што стала больш прафесійных калектываў, пашырылася геаграфія ўдзельнікаў. Аматарскія калектывы таксама паказвалі сёлета больш якасныя працы, якія можна было разглядаць яшчэ і з пазіцый мастацкасці. Для папулярызацыі тэатральнага мастацтва гэта, безумоўна, добра. Але надалей, думаю, фестываль павінен больш дакладна вызначыцца са сваёй спецыфікай. Бо цяперашні этап успрымаецца хутчэй “пераходным”. Усім зразумела, што паказаць чарговы, нічым не прыкметны пераказ гісторыі пра цара Ірада — замала. Але дзе тыя межы, што вылучаюць гэты фестываль сярод іншых? Невыпадкова Гран-пры атрымаў спектакль “Скінія залатая” з Львова. Там было найперш траплянне ў спецыфіку “Нябёсаў”, а да таго ж спалучэнне аўтэнтыкі, сучаснасці, прыгажосці.

— Пашырэнне межаў, — працягвае тую ж думку член журы, мастак і тэатразнаўца Надзея Якаўлева, — з’ява непазбежная. Але яе трэба ўмець выкарыстоўваць так, каб батлеечная тэма заставалася стрыжнявой. Сапраўды, карані батлейкі — у калядным тэатры. Але насамрэч яна больш шырокая: у ёй ёсць і народна-камедыйныя пласты, і жывыя стасункі з публікай. А ў сучасных рэаліях усё гэта яшчэ і трансфармуецца, прарастае ў новыя адгалінаванні — і пры гэтым захоўвае ўнутры нейкія шчымлівыя ноты. На гэтае развіццё батлейкі і павінен быць скіраваны фестываль.

Але ж ці трэба рэзка адмяжоўвацца ад усяго, што “не батлейка”? Наўрад ці. Па-першае, разнастайнасць яшчэ ніколі не перашкаджала. Па-другое, заўсёды ёсць чаму павучыцца не толькі ў бліжэйшых калег, але і ў прадстаўнікоў іншых тэатральных сфер — і фестываль такую магчымасць дае. А каб не страціць батлеечную скіраванасць, выйсце заўсёды знойдзецца.

— Думаю, надалей трэба падзяліць удзельнікаў па розных намінацыях, — лічыць член журы, галоўны рэжысёр Гродзенскага абласнога тэатра лялек Алег Жугжда. — Прычым гэта павінен быць падзел не на прафесіяналаў і аматараў, а на батлейку і іншыя спектаклі. Сучасны тэатр лялек імкліва развіваецца ў самыя розныя бакі, сінтэзуе дасягненні іншых відаў мастацтва. І не зважаць на гэта не толькі нельга, але і няправільна. Батлейка ж мае сваю спецыфіку, нават каноны, не гаворачы пра шматлікія традыцыі, якія таксама трэба працягваць і развіваць. Да ўсяго, у беларускай батлейцы ёсць свае нацыянальныя рысы, што вылучаюць яе, да прыкладу, ад украінскага вярцепа. Таму фестываль павінен развівацца і ўшыр і ўглыб, садзейнічаючы больш плённай працы з тымі нацыянальнымі здабыткамі, што захаваліся і атрымліваюць сёння другое нараджэнне.

Невыпадкова другі год запар на фестывалі ладзіцца “Школа батлейкі”. Яна ўключае ў сябе лекцыі, майстар-класы вядучых спецыялістаў, у тым ліку — членаў журы і ўдзельнікаў. Слухачы праекта папаўняюць свае тэарэтычныя веды, удасканальваюць практычныя навыкі. Але ж як падлічыць той плён? І ці ёсць ён увогуле? Ці былі відавочныя сёлета вынікі тых жа леташніх ініцыятыў? Ці палепшылася практычнае засваенне вырабу батлеечнай скрыні, лялек, пастаноўкі спектакляў?

— Безумоўна, вынікі заўважныя, — сведчыць Кацярына Яроміна. — Яны выяўляюцца ў павышэнні ўзроўню паказаных на фестывалі батлеечных спектакляў. Але, як я ўжо гаварыла, сёлета іх было не так многа, як раней. На жаль, не ўсе змаглі падрыхтаваць штосьці новае, каб прывезці на фестываль. А хтосьці, можа, і падрыхтаваў, ды не рызыкнуў прадэманстраваць, разумеючы неабходны ўзровень. Упэўнена, гэта часовыя цяжкасці. Чым больш шырока будзе ладзіцца такі абмен вопытам, тым больш адчувальным стане яго засваенне.

— Тым не менш, — дадае Надзея Якаўлева, — з беларусаў я вылучыла б сямейны тэатр з вёскі Стойлы, адзначаны “За лепшае мастацкае афармленне батлеечнай скрыні”, сям’ю Паповых з Мінска, узнагароджаную “За вопыт засваення батлеечнага жанра”. Абодва калектывы паказвалі “Цара Ірада”, але кожны — са сваім падыходам. Ды ўсё ж калі сёлетнія спектаклі, лекцыі, майстар-класы кагосьці “зачапілі”, натхнілі, вынік мы ўбачым не адразу. Для больш грунтоўнага засваення батлеечных традыцый, а тым больш — для іх паспяховага працягу, прыўнясення адметных рысаў патрабуецца час.

Звернем увагу і на выхаваўчыя моманты, якія нясе ў сабе фестываль і, шырэй, зацікаўленасць тэатрам лялек сярод дзяцей і бацькоў. Такі від сумеснай дзейнасці замацоўвае сямейныя адносіны. Зварот да згаданай вышэй тэхнікі эбру можа выкарыстоўвацца як адна з дзейсных формаў рэлаксу і арт-тэрапіі, прычым для людзей розных узростаў. Эстэтыка тэатра лялек звязана з “ажыўленнем” любога побытавага прадмета (тут не абысці “ЧерДачные истории” маскоўскага “Мамінага тэатра”, узнагароджаныя спецыяльным дыпломам памяці Людмілы Ждановіч, якая была заснавальнікам фестывалю, “За самы гарэзлівы і вясёлы спектакль”). Такое ўменне “ажыўляць нежывое” развівае фантазію, вучыць беражліваму, адухоўленаму стаўленню да ўсяго навакольнага. Нарэшце, выкарыстанне лялек, незалежна ад іх канструкцый, можа дапамагчы вырашэнню многіх псіхалагічных праблем.

Таму колькі ні гаварылі б пра “разбуральнае ўздзеянне” на дзяцей тых жа бонсцікаў, эмоджы ды іншых “бонусаў”, уключаючы начынне “Кіндэрсюрпрызаў”, справа не ў праславутых фігурках і іх калекцыянаванні, а ў нашым да гэтага стаўленні. Як на мой погляд, яны — гатовыя наборы “герояў-масак”, прыдатныя для далейшых фантазій. Пра іх можна і казкі складаць (вядома, разам з дзецьмі), і разыгрываць спрэчныя гісторыі з рэальнасці, адаптаваныя пад прыгоды вясёлых-сумных чалавечкаў (а памятаеце тых вясёлых чалавечкаў, што ў савецкія часы жылі на старонках часопіса “Весёлые картинки” — і ніхто не адмаўляў іх выхаваўчай ролі). Адна з расійскіх кампаній, прасоўваючы сваю харчовую прадукцыю для дзяцей, пайшла яшчэ далей: пачала бясплатна, але на аснове дасланых заявак, раздаваць наборы для самастойнага вырабу тэатральнай скрыні. А папяровыя цацкі, што стануць героямі спектакляў, — у дадатак да прыдбаных таваражкоў ды ёгуртаў. Цудоўны маркетынгавы ход! Вось толькі... нягледзячы на папярэджванні, што колькасць бясплатных набораў абмежаваная, акцыю давялося працягваць зноў ды зноў: штосьці далёка не ўсе бацькі імкнуліся атрымаць падарунак. Можа, таму, што ён патрабуе асабістага ўдзелу?

А між тым, чарада падобных герояў магла б працягваць і некаторыя беларускія традыцыі. У нас такая багатая міфалогія, столькі каларытных казачных, абрадавых персанажаў! Усё гэта можа стаць асновай для далейшых распрацовак.

Так што перспектывы і ў фестывалю “Нябёсы”, і, шырэй, у развіцця батлеечнага тэатра — цудоўныя. І выходзяць яны далёка за межы невялічкай непрыстасаванай залы, дзе праходзяць фестывальныя паказы.

к

Сімфонія зіхатлівага пылу

Персаналка віцебскага мастака і дызайнера Аляксандра Вышкі “13-ты цуд свету” праходзіць не ў галерэі, а ў аднайменным сталічным гандлёва-забаўляльным цэнтры, куды людзі ідуць, здавалася б, зусім не па мастацтва. І тым не менш — глядацкі поспех пераўзышоў чаканні арганізатараў, і таму выставу, якая мусіла завяршыцца ўжо ў сярэдзіне студзеня, было вырашана прадоўжыць да пачатку сакавіка.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

На выставе ў Мінску Аляксандр Вышка прадставіў плён эксперыментаў з фарбамі, што свецяцца ў цемры.

Аляксандр Вышка — сталы майстра. Наш тэатральна-мастацкі інстытут ён скончыў у далёкім ужо 1979 годзе. Тады ж вярнуўся ў родны Віцебск, з якім звязаныя ўсё ягонае жыццё і творчасць. На творчым рахунку дызайнера — удзел у шматлікіх выставах і конкурсах плакату ў Беларусі і за яе межамі, распрацоўка графічных канцэпцый для віцебскіх культурных фэстаў “Славянскі базар”, “Белы сабака”, “Белая амфара”, Шагалаўскага пленэру, макеты фотаальбомаў прэзентацыйнага характару.

Але графічны дызайнер — не адзіная ягоная іпастась. Працаваў ён і як мастак-сцэнограф у Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Якуба Коласа, выкладаў дызайн на мастацка-графічным факультэце Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта, спрычыніўся да стварэння фільма “Шагал — Малевіч”, рабіў музейныя экспазіцыі, прысвечаныя гісторыі Віцебска і фестывалю “Славянскі базар”. Таксама Аляксандр Вышка стварае інтэр’еры — грамадскія і для прыватных асоб. А яшчэ ён здумлівы жывапісец і графік з добрым пачуццём гумару. Адным словам, Вышка мог заяродзіцца толькі на адным з чыннікаў творчасці, удасканальвацца толькі ў адным напрамку, але замест вузкай сцежкі абраў шырокае поле.

Аляксандра я ведаю са студэнцкіх часоў. Мы аднакурснікі. У нашым коле Вышка вылучаўся выключнымі творчымі здольнасцямі. Тады вучыцца ў БДТМІ дызайну (прамысловаму мастацтву, паводле тагачаснай тэрміналогіі) і дэкаратыўна-прыкладному мастацтву прыходзілі тыя, хто ў спецыяльных дысцыплінах — малюнку і жывапісе — не дацягваў да стандартаў мастацкага факультэта. Гэта сёння некаторыя спецыялізацыі дызайну для абітурыентаў больш прывабныя за жывапіс-графіку-скульптуру. Таму я ды мае аднакурснікі здзіўляліся: што ў нас робіць Саша, які так цудоўна малюе? Маўляў, яму б на графіцы вучыцца.

Як і калі ён паспеў набыць такі прафесіяналізм — незразумела. Родам Аляксандр Вышка не з мастакоўскай сям’і, дзе можна было б атрымаць пачатковыя веды па мастацтве і ў спрыяльных умовах развіць прыродныя творчыя схільнасці. Ягоны бацька вайсковец, лётчык транспартнай авіяцыі. Па нацыянальнасці ўкраінец. Маці — беларуска з Віцебшчыны. Яе радзіма — вёска Рыжыкі, гэта непадалёк ад таго месца, скуль родам бацькі Марка Шагала. А Саша нарадзіўся ў Расіі, у Амурскай вобласці.

Магчыма, дзяцінства, праведзенае ў гарнізонах, прывучыла яго да дысцыпліны, у тым ліку і творчай. У ягонай натуры не было ні каліва багемнай разняволенасці. Вучэбнае заданне станавілася для яго чымсьці накшталт вайсковага загаду, які не абмяркоўваецца і патрабуе якаснага выканання, а яшчэ лепей — узорнага. Калі на апошнім курсе паўстала пытанне пра дыпломныя тэмы, Саша заявіў, што яму ўсё адно: ён любую тэму, якую прапануе кафедра, зробіць добра. І сапраўды, узяўшы тэму, у якой цяжка сказаць новае слова, Вышка выканаў дыплом выдатна, прадэманстраваўшы здольнасць разбураць, здавалася б, непахісныя стэрэатыпы. І ўсё ў яго было так: нібыта ўплішчваецца ў “пракрустава ложа” задання, а насамрэч робіць сваё, тое, што яму самому цікава. Гэта рэдкі талент!

Выставу Аляксандра Вышкі ў Мінску можна лічыць юбілейнай. Пазалетась спадару Аляксандру споўнілася 60. І, паводле ягоных слоў, захацелася яму азірнуцца, узгадаць студэнцкія гады, сустрэцца з аднакурснікамі і выкладчыкамі; выказаць сантымент Мінску, дзе ён сфарміраваўся як творца. Прывёз мастак у сталіцу свае светла-дынамічныя аб’екты, якія мелі шалёны поспех у Віцебску, дапоўніўшы экспазіцыйны стрыжань графікай сацыяльнага зместу і жывапісам містычна-рамантычнага характару.

Сам мастак распавядае, што штуршком да светла-дынамікі стаў вялікі пратрус, які ён вырашыў зрабіць у сваёй майстэрні. Бадай, кожнаму знаёмая сітуацыя, калі падчас рамонту ў хаце з розных кутоў выпаўзаюць рэчы, прызначэнне якіх ужо не памятаеш, што рабіць з імі, не ведаеш. “Я стаў перад выбарам, — кажа Аляксандр, — выкінуць гэты хлам на сметнік альбо ператварыць яго ў твор мастацтва і зладзіць арт-шоу”. На той момант Вышка ўжо эксперыментаваў з фарбамі, якія свецяцца ў цемры (іх называюць люмінесцэнтнымі ці флуарэсцэнтнымі) і змяняюць колер пры спецыяльным асвятленні.

Скампанаваўшы выратаваныя ад сметніка рэчы ў інсталяцыі, надаўшы ім эстэтычных якасцяў з дапамогаю адмысловых фарбаў і асвятлення, Аляксандр зрабіў са сваёй майстэрні салон светла-дынамічнага мастацтва, як ён сам кажа, “сімфонію зіхатлівага пылу”. Рабочая прастора ператварылася ў падабенства кэралаўскага Залюстроўя. Майстэрня стала выставачнай залай. Потым была выстава ў віцебскім Цэнтры сучаснага мастацтва. Гэтыя дзве выставы аб’яднаны ў адну, якая зараз экспануецца ў Мінску. Дарэчы, ёй ужо зацікавіліся латышы і палякі. Магчыма, пасля нашай сталіцы яна паедзе за мяжу.

Каб зразумець, што ўяўляе з сябе светла-дынаміка ад Аляксандра Вышкі, уявіце начное асвятленне горада. Сілуэты, нібыта, знаёмыя, але фарбы, вобраз, настрой — іншыя. Тое ж і тут: дзякуючы спецыяльным фарбам і асвятленню, звычайныя рэчы набываюць містычна-рамантычную вобразнасць. У светлавых інсталяцыях Аляксандра хоць і прысутнічае тэма, якую кожны можа трактаваць у адпаведнасці з уласным эстэтычным досведам, але звернутыя яны найперш да пачуццяў і маюць мэту справакаваць станоўчыя эмоцыі. Выставу можна параўнаць з тэатральнай дзеяй, да якой актыўна далучаны глядач. Асабліва яна падабаецца дзецям. Так што прыходзьце ўсёй сям’ёй!

к

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 3.)

“Вянок” у гонар

“Вянок” у выкананні аркестра і салістаў працягвае іншыя падобныя працы калектыву па аднаўленні і “песняроўскай” спадчыны (раней былі “Гусляр” і “Песня пра долю”). Гэты песенны цыкл паводле Максіма Багдановіча ствараўся Мулявіным да 100-годдзя паэта. Прэм’ера адбылася ў Амерыцы, у бібліятэцы ААН. У нас праграма цалкам выконвалася толькі аднойчы, таксама ў філармоніі. Ноты не захаваліся — хіба аматарскі аўдыязапіс прагону на сцэне філармоніі. На яго аснове дырыжор, саліст і аранжыроўшчык аркестра Аляксандр Крамко аднавіў цыкл, зрабіў новую аркестроўку ў разліку на свой калектыў. Часткова гэта праграма прэзентавалася ў верасні на адным з канцэртаў ля Ратушы, у снежні — у філармоніі. Але тыя выкананні можна назваць “перадпаказамі” напярэдадні галоўнага, цяперашняга, за якім, трэба спадзявацца, будуць і далейшыя — па ўсёй краіне.

15 песень былі падзелены між трыма вакалістамі. Андрэй Коласаў спяваў выдатна. Вячаслаў Ісачанка — шыкоўна. Праграма дала добрую магчымасць нанова ацаніць і яркі, сакавіты голас Яна Жанчака — з кранальным вібрата, без аніякага бэлькання, з цудоўнай філіроўкай гуку, што ўспрымаецца не дэманстрацыяй магчымасцяў, а вольнай апавядальнасцю і ў спалучэнні з заокругленасцю фразіроўкі стварае адчуванне Боскай гармоніі. Вось на каго сёння трэба пісаць і ставіць мюзіклы!

У песні “Па-над белым пухам вішняў” (не блытаць з рамансам Ігара Паліводы з яго поп-оперы “Максім”, датаваны годам пазней — 1992-м) быў падкрэслены кантраст між танцавальнасцю, песеннай хваляй і рэчытатывам. У хіце Ігара Лучанка “Вераніка” (гэтая песня, як і “Зорка Венера” Сымона Ракміхайлоўскага, былі ўключаны Мулявіным у цыкл на правах класікі) саліст пераадолеў квадратнасць, дасягнуў неверагоднай натуральнасці, шчырасці, спалучыў зачараванасць і боль за сыход прыгажосці. А ў фінале джазавай імправізацыі дадаў ледзь улоўныя элементы беларускіх традыцый гукання вясны.

Песні дапаўняліся відэашэрагам, але той успрымаўся хутчэй “данінай сцэнаграфіі”, гэткім “апраўданнем” экрана, што застаўся з першага аддзялення. Бо выявы ў лепшым выпадку ілюстравалі музыку, а часам ішлі ўразрэз з ёй, парушаючы драматургію.

У аркестры ж не хапала голасу беларускіх цымбалаў. Не, музыканты гралі ва ўсю моц, палачкі так і лёталі па струнах! Але ж ці магла цымбальная акварэль спаборнічаць з рокава-“ракавымі” гітарнымі напластаваннямі? Вядома, аранжыроўшчык і гукарэжысёр арыентаваліся на “песняроўскае” гучанне. Ды толькі галоўнай мэтай Уладзіміра Мулявіна была зусім не рокстылістыка, а дасягненне індывідуалізацыі — на фоне іншых гуртоў былога Саюза і заходняга замежжа. Адметнасць яго ансамбля ўзнікала, у тым ліку, праз выкарыстанне старадаўніх беларускіх інструментаў, голас якіх не “патанаў” у агульным tutti, а выводзіўся на першы план. Таму і цяпер цалкам лагічна было б прытрымлівацца не літары, а самога духу мулявінскіх традыцый. Тым больш, у новых аркестравых версіях, якія самі па сабе — вялікі творчы подзвіг усяго калектыву імя Іосіфа Жыновіча.

к



А колькі, пане дабрадзею, ваш жарэбчык каштуе?

Зэльвеншчына: рэнесанс Ганненскага кірмашу

Калі ў раённага цэнтра няма легенды, яе варта прыдумаць. А калі ёсць? Трэба яе давесці да кандыцыі культурна-гістарычнай каштоўнасці і эканамічнай значнасці. Сапраўдны брэнд — не яркі лапік на састарэлым адзенні. Ён павінен працаваць. На станоўчы імідж раёна, яго турыстычную ды інвестыцыйную прывабнасць. А на Зэльвеншчыне і прыдумляць нічога не трэба было. Тут яшчэ ў XVIII стагоддзі дзейнічаў Ганненскі кірмаш, другі па значнасці пасля Лейпцыгскага. Заставалася толькі вярнуць яго з гістарычнага нябыту і надаць яму другое дыханне.

Увасабленне ідэй

Яўген РАГІН, Мінск — Зэльва і Зэльвенскі раён Гродзенскай вобласці — Мінск / Фота аўтара

Кірмашовы рэнесанс у Зэльве быў распачаты ў 2001 годзе. Ініцыятар — мясцовыя работнікі культуры на чале з начальнікам аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Галінай Раманчук. Для яе, рэжысёра масавых мерапрыемстваў, праект стаў ці не галоўным клопатам жыцця. Мяркуйце самі, для гарадскога пасёлка, дзе амаль не засталося вытворчасці, кірмаш павінен быў стаць пэўным каталізатарам тых працэсаў і з'яў, якія не даюць грамадству супакоіцца ва ўласным развіцці.

Зэльва, што знаходзіцца на Беластоцкай трасе, калісьці вабіла купцоў не толькі з Саксоніі, Баварыі, Нідэрландаў, Італіі, Францыі, Даніі, але і ўсходніх краін. Кірмаш доўжыўся месяц. А наведвалі яго штогод каля трох тысяч чалавек. Прыбытак казне і жыхарам мястэчка быў вельмі вялікі. Па абароце і шчыльнасці гандлёвых сувязяў кірмаш выходзіў далёка за межы лакальнага рынку. Вось такія былі традыцыі. Дык ці варта на іх забывацца?!

ГІСТОРЫЮ СВАЙГО КУТКА ВЕДАЦЬ

Забывацца, канешне не варта. Тым больш, у каго не спытаю пра Ганненскі кірмаш, ніхто пра яго не ведае. Таму, напэўна, варта згадаць, якім быў Ганненскі кірмаш, прывілей на правядзенне якога атрымалі Сапегі, а яго росквіт прыпадае на другую палову XVIII стагоддзя, калі Зэльвай валодаў канцлер ВКЛ Аляксандр Сапега. Кірмаш пачалі праводзіць на Дзень святой Ганны. Адсюль і назва. Доўжыўся ён з 25 ліпеня цягам месяца. На тым месцы, дзе цяпер знаходзіцца галоўная плошча райцэнтра, будаваліся часовыя гандлёвыя паветкі, часам — звычайныя намёты з лазы. Вельмі строга адсочвалася супрацьпажарная дысцыпліна. Камерцыйныя здзелкі, кантракты ладзіліся ў шматлікіх шынках.

Прадаваўся тавар расійскі, еўрапейскі, азіяцкі каланіяльны. Раскупляліся рагатая жывёла, футра, тытунь, мыла, свечкі, посуд, тканіна, нават кнігі... Але галоўным прадметам аптовага гандлю заставаліся коні. Галоўны табун Аляксандра Сапегі складалі жарабцы англійскай, турэцкай, дацкай, неапалітанскай парод (больш за тысячу галоў). З тых часін на гербе Зэльвы — конь як сімвал прыгажосці, моцы і пераможнасці. Было ў мястэчку і казіно з рулеткай. А за права выступіць на кірмашы змагаліся артысты тэатраў, музыканты, цыркачы, балаганшчыкі, фокуснікі, цыганы з дрэсіраванымі мядзведзямі і цыганкі з нязменнымі гадальнымі картамі.

Натуральна, кірмаш збіраў вялікую колькасць злодзеяў, махляроў, канакрадаў, жанчын лёгкіх паводзін, якіх гісторык Андрэй Кіштымаў называе вытанчана "ахвярамі грамадскага тэмпераменту". Зэльвенцы ўсе гэтыя беды з гатоўнасцю цярпелі, бо мелі магчымасць здаваць гасцям наёмнае жытло, прадаваць ім шматлікія кулінарныя стравы. Гісторык Юзаф Крашэўскі пісаў: "Адзінаццаць месяцаў зэльвенцы марнеюць, а толькі месяц жывуць". Кажуць, у кірмашовым віры распаўсюджваў сваю "Мужыцкую праўду" Кастусь Каліноўскі.

А што рабіць з тым, што мала хто ведае ў Беларусі пра Ганненскі кірмаш? Рэкламаваць у поўны голас і ўсімі магчымымі сродкамі! Намеснік старшыні райвыканкама Валянцін Семяняка пагаджаецца, што тут недапрацовак яшчэ шмат. Самы час іх выпраўляць. Ад сціпласці ў дадзеным выпадку — ніякай практычнай карысці. Адно толькі — галаўны боль з прычыны нерэалізаваных інфармацыйных магчымасцяў. А пакуль пра нюансы сённяшняга свята не ведаюць нават у Гродзенскім аддзяленні Гандлёвай палаты Рэспублікі Беларусь.

НАВУКОВУЮ АСНОВУ ПАДВЕСЦІ

Дык вось, усю гэтую стракатую кірмашовую прыгажосць мясцовыя работнікі культуры вырашылі рэканструяваць. Другое дыханне адноўлены кірмаш у форме аўтэнтычнага фальклорнага свята займеў у 2010 годзе, калі раён быў вызначаны ў якасці пілотнай пляцоўкі для ажыццяўлення сумеснага праекта Праграмы развіцця ААН і Еўрапейскага саюза "Устойлівае развіццё на мясцовым узроўні". Зэльва тады атрымала грант. Кірмашовае свята набыла абласны статус.

Але спачатку трэба было сабраць усе звесткі пра Зэльву часін Сапегаў. За справу ўзяліся не толькі навукоўцы, але і бібліятэкары. Каб не іхняя скрупулёзная праца, не было б падстаў для сённяшняй кірмашовай аўтэнтыкі. Як аказалася, да яе вельмі сур'ёзна ставіцца намеснік старшыні Зэльвенскага райвыканкама Валянцін Семяняка. "Кожнае свята, — сцвярджае ён, — мы ладзім з абавязковым удзелам навукоўцаў". Так, навуковыя канферэнцыі падчас кірмашоў сталі традыцыяй. Гаворка вядзецца не толькі

На здымках:
1 Старшыня Зэльвенскага райвыканкама Ян Пальчыс і ягоны намеснік па сацыяльных пытаннях Валянцін Семяняка перакананы: іхні кірмаш быў і будзе знакавым для Беларусі.
2 Настаўнік выяўленчага мастацтва ДШМ Жанна Еўтухоўская разам з выхаванцамі адказвае за афармленне горада падчас кірмашу.
3 Тыя, хто забяспечваюць кірмаш сувенірамі: дырэктар дома рамёстваў у Дзярэчыне Ала Сідорчык пляце паясы на ніту...
4 ...рэзчык РДР Валерый Фяцінскі.
5 Сімвал Зэльвы — жарабя — на гарпасялковай плошчы.
6 Загадчыца клубнай установы Дзярэчына Валянціна Лапа — галоўная кірмашовая цыганка.
7 У музейным пакоі ў гонар кірмашу Цэнтра культуры (злева направа) загадчык аддзела абслугоўвання і інфармацыі раённай бібліятэкі Валянціна Масюк, дырэктар РЦК Вольга Саўко і дырэктар райбібліятэкі Святлана Жамойціна з таварам, які прадаваўся на кірмашы.
8 Сярод тых, хто агучвае ды ажыўляе кірмаш, — і харэограф ДШМ Цімафей Жукоўскі.

пра Зэльву, якую Сапегі называлі графствам, але і пра Дзярэчын, дзе знаходзіўся маёнтак Сапегаў, пра Сынкавіцкую царкву, заснаваную яшчэ Кейстутам... Дарэчы, арганізаваныя групы турыстаў, якія прыязджаюць на кірмаш, могуць наведаць усе гэтыя аб'екты, а спецыяльна падрыхтаваныя валанцёры стануць гідамі і насыцяць вандроўку карыснай фактурай. Няма праблем і з размяшчэннем гасцей. У гарпасёлку — дзве досыць камфортныя гасцініцы (адна — прыватная, ля вадасховішча, дзе праводзіцца ладная частка святочных мерапрыемстваў), а ў раёне — шэсць аграсядзіб.

СВОЙ ГОНАР МЕЦЬ

Навуковыя даследаванні даўніны часін Сапегаў не спыняюцца. Адкрываюцца ўсё новыя і новыя старонкі кірмашовай гісторыі. Гэта дазваляе Галіне Раманчук не паўтарацца ў сцэнарыях свята, адшукваць свежыя рэжысёрскія хады. Валянціна Семяняку такая перспектыва гнуткага развіцця творчага кірмашовага складніку таксама радуе. Але, хоць і творчы ён чалавек, неблагія вершы піша, аднак жа ў першую чаргу — гаспадарнік. Таму Валянцін Міхайлавіч хоча, каб сённяшні кірмаш набыў яшчэ і эканамічнае гучанне. Канешне, не такое выразнае, як стагоддзі таму, але менавіта эканамічнае. Паспрабавалі сабраць коней ці не з усёй рэспублікі. Пра аптовыя продажы гаворка не ішла, але і рознічны гандаль маштабамі не парадаваў. Паспрабавалі аўкцыён "безгаспадарных" будынкаў правесці — таксама амаль безвынікова.

Я, да прыкладу, цудоўна разумею сітуацыю. Фальклорнае свята паводле колішняга Ганненскага кірмашу правесці, ды так, каб кожны жыхар гарпасёлка і раёна хоць штосьці ды зрабіў для гэтага кірмашу, — справа неймаверна цяжкая, але цалкам рэальная. Уключыць жа пры гэтым яшчэ і эканамічныя механізмы — задача, прама скажам, пакуль няпростая. Вырашэнне яе — на стыку ведамасных інтарэсаў. Ды яшчэ пры тым, што летась на Століншчыне прайшоў ужо трэці па ліку конны фестываль "Палеская ніва". Значыць, трэба сесці з прадстаўнікамі Міністэрства сельскай гаспадаркі за стол перамоваў, вызначыць прыярытэты, статусы абодвух мерапрыемстваў, іх перспектывы міжнароднага развіцця. Цяжка, складана (Міністэрства сельскай гаспадаркі, наколькі ведаю, асаблівай ініцыятывы тут не праяўляе), але трэба. Гістарычная справядлівасць ды колішні імідж Ганненскага кірмашу вымагаюць. Задача-мінімум — правесці падчас зэльвенскага свята эканамічны форум, што ладзіцца ў Гродне.

Але, па меркаванні старшыні Зэльвенскага райвыканкама Яна Пальчыса, адбылося галоўнае: абудзілася прыватная ініцыятыва жыхароў раёна. Яны навучыліся зарабляць. І ўрэшце леташні кірмаш стаў рэнтабельным. Спрацавалі ў раёне, як у народзе кажуць, так на так. Хоць і даходаў не атрымалі, але і расходы здолелі кампенсаваць. Кірмаш стаў самадастатковым.

Не магу не заўважыць і вось яшчэ што. Пасля першага свята кірмашы пачалі адраджаць і ў іншых раёнах. Справа, безумоўна, неблагая. Але знешні выгляд запрашальнікаў, праграмак, буклетаў быў "запазычаны" ў Зэльвы. І яна пакрыўдзілася, маўляў навошта плагіятам займацца, кожнаму раёну свой гонар трэба мець. Слушна! Аўтарскія правы неабходна адстойваць.

КОЖНАГА Ў ТВОРЧЫ ПАЛОН УЗЯЦЬ

Падчас свята яго ўдзельнікі пераапранаюцца ў касцюмы па модзе сапегавых часін. Шые льняныя кашулі і сарафаны мясцовае прадпрыемства бытавога абслугоўвання. Людзі ў чаргу становяцца. Камунгас забяспечвае дзейнасць санітарных зон. Прыватныя прадпрымальнікі задоўга да свята прапаноўваюць спонсарскую грашовую падтрымку. Школьнікі збіраюць матэрыялы па мясцовых кулінарных стравах, паводле якіх выдаюцца зборнічкі і з поспехам разыходзяцца з кірмашовых прылаўкаў. Юныя мастакі ДШМ робяць шыльды з новымі назвамі для крам. Эстрадныя і фальклорныя калектывы запрашаюцца нават з замежжа. З усіх куткоў Беларусі ў Зэльву едуць прадстаўнікі конна-спартыўных школ і рыцарскіх клубаў. Стадыён "Колас" пераўтвараецца ў іпадром і ў поле бітваў ды турніраў. Свае адметнасці на галоўнай плошчы гарпасёлка прэзентуюць не толькі сельсаветы, але і сельскагаспадарчыя арганізацыі. Свой унёсак у кірмаш робяць штогод і сельскія ўстановы культуры, і гарпасялковыя. У сувенірах, танцах, вулічных музыкантах і спеваках недахопу свята не мае. Больш фантазіі з'явілася ў мясцовай хлебнай прадукцыі. Больш сістэмна пачаў працаваць зэльвенскі гандаль. Уяўляеце, што за ўсім гэтым стаіць? Начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Галіна Раманчук уяўляе.

За гады існавання вось якімі рэжысёрска-сцэнарнымі цікавосткамі абрастала святочная праграма. Гэтай найперш конкурсы: касцюма, каравая, афармлення балкона жывога дома ў стылістыцы XVIII стагоддзя (Зэльва нагадвала яркую шматковую коўдру), конных вазкоў, відэасюжэтаў на кірмашовую тэму... І памылак пры гэтым было роўна столькі, колькі і перамог.

Знаёмцеся: асоба!

Чалавек з баянам

З музыкантамі вельмі цяжка гаварыць, яшчэ цяжэй — іх зразумець. Але для журналіста першае і другое — задачы непазбежныя і абавязковыя. Каб я быў баяністам (казала ж мне мама: "Ідзі, сынок, у музычную школу!"), мы проста пайгралі б. Я, ён, потым — разам. І прыйшлі б да высновы, што жыццё — нібы нотны аркуш: кожны сам выбірае сабе патрэбныя ноты і акорды, кожны сам складае музыку свайго лёсу.

Выкладчык Зэльвенскай ДШМ па класе баяна Аляксандр Сямёнчык.

У Аляксандра Сямёнчыка гэтая музыка — віртуозная і жыццясцвярджальная, нават калі сумная. Ён спрабаваў пісаць песні. Атрымлівалася. Але больш даспадобы вучыць дзяцей. Тлумачэнне — простае. Музыкант, няхай сабе і самадзейны, лепей адчувае жыццё, вакол яго — больш дабрыні, любові, суперажывання. Калі ты музыкант, нервы ў цябе аголеныя, трапяткія... Не буду пералічваць вучняў Аляксандра Баляслававіча, бо іх вельмі шмат. Многія паспелі самі стаць знанымі педагогамі. Словам, межы дабрыні вакол гэтага чалавека з нязменным баянам пастаянна павялічваюцца. На сёння яны акурат з гандлёвую плошчу Ганненскага кірмашу. Калі ён выходзіць з баянам на вуліцу, вуліца пачынае падпяваць яму. Нават коні выгінаюць шыі больш вытанчана і асэнсавана.

А што вы скажаце на гэта: Аляксандр Сямёнчык можа вывесці на кірмаш сямейны квартэт баяністаў. Жонка — Ніла Іванаўна — працуе ў Зэльве музычным кіраўніком дзіцячага садка. Васьмікласніца дачка Наташа — лаўрэат двух міжнародных музычных конкурсаў. Сын Павел (22 гады) вучыцца ў Акадэміі музыкі, адточвае майстэрства ігры і на баяне, і на фартэпіяна (той жа самы баян, толькі на ножках). Адчуваеце, колькі моцы ў іхнім суладным гучанні?! Ці не такіх музыкантаў аб'яднаў Акуджава ў аркестрык Надзеі пад кіраваннем Любові ды Кахання?

І толькі не пытайцеся ў мяне, хто з іх у вольны ад музыкі час варыць боршч. Хто больш вольны, той і варыць. Аляксандр Сямёнчык перакананы, што музыка патрэбна чалавеку тады, калі яму добра і калі кепска. Інакш кажучы, патрэбна заўжды. І дзеля гэтага настаўнік Зэльвенскай дзіцячай школы мастацтваў гатовы суткамі вучыцца і вучыць.

А фатаграфавацца і размаўляць з журналістамі ён, мякка кажучы, не вельмі любіць. Эх, як бы мы з ім сыгралі, каб я мог!

Замест заканчэння

"Мы гатовы абмяркоўваць супрацоўніцтва!"

Я звязаўся па тэлефоне з намеснікам генеральнага дырэктара Гродзенскага аддзялення Беларускай гандлёва-прамысловай палаты Канстанцінам Кайковым. Ён сапраўды не надта арыентаваўся ў праблемах сённяшнага Ганненскага кірмашу.

Я паспрабаваў давесці мару зэльвенцаў. Абласное кірмашовае свята, што дзейнічае на гандлёвай беластоцкай трасе, мае, падаецца, усе падставы атрымаць у перспектыве не толькі рэспубліканскі, але і міжнародны статус. Што ўрэшце толькі ўмацуе імідж нашай дзяржавы, гатовай на пашырэнне і культурных, і эканамічных стасункаў. Канстанцін Анатольевіч з прыязнасцю зазначыў, што гатовы абмеркаваць з зэльвенскімі ўладамі будучае супрацоўніцтва.

К

Рэкламны банер на галоўнай плошчы гарадскога пасёлка: "Зэльва часін Сапегаў", а вакол банеру адбываецца сёння тое, што і завецца сучасным Ганненскім кірмашом.

Бывай, ёлачка, бывай!

Наш узорны дворнік сёння зранку радаваўся: міжсезонне скончылася, выпаў снег — ёсць праца. Ён зранку шкрэб асфальт сваёй вялікай фанернай рыдлёўкай і весела мармытаў штосьці пра разняволенасць чалавека, які ўдасканальвае асяроддзе да стану гармоніі. У адрозненне ад яго, сезонніка, праца ў работнікаў нашай культуры ёсць заўсёды. Чарговая плойма лістоў на адрас рэдакцыі яскрава тое пацвярджае. Пішу гэтыя радкі 18 студзеня. Заўтра — Вадохрышча. А да нас усё паступае пошта з інфармацыяй пра калядаванні ды шчодрыкі.

Яўген РАГІН

На здымках:
1 Развітанне з навагоднімі святамі ў Дзятлаве.
2 Старшыня журы конкурсу "Францыск Скарына — наш лёс, наша мінуўшчына, наша будучыня" Мікола Купава з пераможцай Палінай Міхайлоўскай.
3 Ганцавіцкі РДР: так робіцца калядная зорка.

Да прыкладу, калядны баль прайшоў у **Карэлічах**. Загадчык аддзела метадычнай работы мясцовага РЦКіНТ Аксана Басюк піша: *“Юныя прынцэсы і кавалеры акунуліся ў атмасферу бальнага палітэсу XIX стагоддзя. У госці да іх завіталі музы мастацтва, танца, тэатра, чараўніцтва і прыгод”.*

У цэнтры культуры **Дзятлава** развіталіся з ёлачкай. Настасся Голуб паведамляе, што ў шоу бралі ўдзел узорны тэатр гульні “Лялькі для ўсіх” і дзіцячая эстрадная студыя “Марсі”.

Пасядзелкамі “Сустракаем Стары Новы год” парадавала **Ашмянская** раённая бібліятэка. Чытачка Ядвіга Макарская прадэкламавала свой верш, прысвечаны навагоднім святам. Як распавядае загадчык аддзела абслугоўвання і інфармацыі Святлана Галінская, можна было паўдзельнічаць у конкурсах ды віктарынах.

Шчодры вечар арганізавалі для аграгарадка **Мураваная Ашмянка** работнікі культуры мясцовага сельскага клуба. Дапамаглі ім артысты фальклорнага гурта “Выток” і ансамбля народнай песні “Жытніца” з аграгарадка **Кракоўка**. Пра гэта напісалі работнікі аддзела метадычнай работы **Ашмянскага** раённага цэнтра культуры.

Работнікі культуры **Кракоўкі** запрасілі аднавяскоўцаў на тэатралізаваны канцэрт “Зімовыя святкі”. Так быў названы і навагодні экспрэс, кожны з “пасажыраў” якога падрыхтаваў канцэртны нумар.

Дырэктар **Навагрудскага** РЦКіНТ Наталля Кавальская піша: *“Да жыхароў аграгарадка* **Пятрэвічы** *калядаваць прыйшлі работнікі мясцовага сельскага дома культуры. Каляду з казой радасна віталі ў кожнай хаце. І калядоўшчыкі, натуральна, без пачастунку не абышліся.”*

У аграгарадках **Гарадзечна**, **Брольнікі**, **Вялікія Вараб’евічы Навагрудскага** раёна адбылася IV акцыя “Калядныя сустрэчы”. Удзел у мерапрыемстве бралі мясцовыя святары.

Калядныя сустрэчы для сталых людзей арганізавалі і ў **Лельчыцкім** цэнтры культуры і народнай творчасці. Рэжысёр установы Юрый Маркевіч распавядае, што фальклорны складнік свята забяспечыў народны ансамбль “Вяснянка” **Ліплянскага** СДК.

“Хрысціянскія вершы на Каляды”. Так называлася мерапрыемства бібліятэкі-філіяла № 6 **Магілёва**. Бібліятэкар Вольга Манькова піша: *“Прыйшлі не толькі аматары прыгожага пісьменства, але і прафесійныя літаратары. Выступіла Міра Баганёва — хрысціянская спявачка, музыкант і паэт”.*

Супрацоўнікі **Ганцавіцкага** раённага дома рамёстваў, удзельнікі і сябры народнага клуба майстроў народнай творчасці “Багач” паехалі шчадраваць у вёскі **Крышылавічы**, **Востраў**, **Нач**, **Гуту**, **Лактышы**, **Боркі**. Малодшы навуковы супрацоўнік раённага дома рамёстваў Наталля Білімава тлумачыць, што насельніцтва тут мала, але сустрэлі гасцей прыязна і не з пустымі рукамі.

А **ганцавіцкія** рамеснікі запрасілі да сябе гасцей. Дырэктар Ганцавіцкага РДР Маргарыта Саланевіч піша: *“На “Шчодры вечар” былі запрошаны не толькі фальклорныя калектывы Ганцаўшчыны, але і з суседняга* **Лунінецкага** *раёна. З лакальнымі асаблівасцямі Калядаў пазнаёмілі дзіцячыя гурты з вёсак* **Люсіна**, **Радзялавічы**, **Хатынічы** *і* **Дзятлавічы**. *Кожнае выступленне дэманстравала захаванне ўсіх этнаграфічных дэталяў, бо юныя ўдзельнікі гуртоў не першы год вывучаюць абрады, спевы, танцы, іншыя складнікі традыцыйнай культуры, папулярызуюць аўтэнтычную спадчыну свайго краю. Вельмі шмат было гледачоў, людзі прыходзілі сем’ямі. Вабіла іх і тое, што ладзіўся ў нас майстар-клас па вырабе калядных сімвалаў: зоркі і маскі. Любы ахвотны мог таксама набыць нашы сувеніры. Ганцавіцкі РДР даўно займаецца не толькі адраджэннем мясцовых рамёстваў, але і тутэйшых народных традыцый, бо першае заўжды вынікае з другога.”*

Настаўніца беларускай мовы і літаратуры Алена Каліноўская піша пра вынікі выставы-конкурсу дзіцячай і маладзёжнай творчасці “Францыск Скарына — наш лёс, наша мінуўшчына, наша будучыня”. Варта нагадаць, што гэтыя творы дэманстраваліся летась у Палацы мастацтваў, на выставе, прысвечанай 500-годдзю беларускага кнігадрукавання. У ёй бралі ўдзел навучэнцы **Брэсцкай** школы мастацтваў імя Аляксандра Алонцава, **Гродзенскай** мастацкай школы, **Мінскай** мастацкай гімназіі-каледжа, **Рэспубліканскай** гімназіі-каледжа мастацтваў імя Івана Ахрэмчыка, узорнай студыі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва “Крынічка” **Рэспубліканскага** цэнтра дзіцячай і маладзёжнай творчасці, сярэдняй школы № 20 **Оршы**, сярэдняй школы № 53 **Мінска**. Перамагла Паліна Міхайлоўская — навучэнка Гродзенскай мастацкай школы. Яе работа называецца “Францыск Скарына з першай друкаванай беларускай кнігай.”

Аршанскай дзіцячай школе мастацтваў № 3 споўнілася сорак гадоў. Святочныя мерапрыемствы з гэтай нагоды адбыліся ў Палацы культуры **Барані**. Для гасцей свята выступілі лаўрэаты міжнародных конкурсаў Ганна Мамантава, Вадзім Шахманаў, Арына Іванова, Мар’яна Лесніна, музычныя і вакальныя ансамблі.

У кожнай бібліятэцы, хатняй ці публічнай, сустракаюцца кнігі з памятнымі і дароўнымі надпісамі аўтараў. Ёсць такія асобнікі і ў фондах **Кліавіцкага** раённага краязнаўчага музея. Распавядае старшы навуковы супрацоўнік установы Уладзіслаў Міцічаў. У фондах музея — паўсотні выданняў (ад мастацкай літаратуры да навуковых фаліянтаў) з подпісамі вядомых асоб, а таксама аўтараў дадзеных твораў. Кнігі трапілі ў музей рознымі шляхамі. Адны перадавалі самі аўтары, другія прыносілі сваякі ці выпадковыя, але неабыякавыя чытачы. *“Самы стары подпіс у нашай калекцыі,* — распавядае аўтар, — *датуецца 25 жніўнем 1945 года. Яго зрабіў Антон Бялевіч у сваім зборніку паэм і вершаў “Чалавек з дубровы”, які прэзентаваў сябру — маёру Паўлу Кавалёву. У музей зборнік перадаў у 2014 годзе Мікалай Кавалёў”.* Калі выпадкова да вас трапіць томік з памятным надпісам, не спяшайцеся закідваць яго на дальнюю паліцу. Магчыма, аўтар подпісу — чалавек нешараговы і кніжку варта захаваць для нашчадкаў.

Загадчык аддзела маркетынгу **Бярэзінскай** цэнтральнай раённай бібліятэкі Тамара Круталевіч нагадала пра знамянальныя даты: 80-годдзе Мінскай вобласці і 65-годдзе Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. *“Таму літаральна з першага месяца,* — піша аўтар, — *работнікі культуры раёна распачалі доўгатэрміновую імідж-кампанію “Мінішчына мая, мы — часцінка твая”. Распавяду толькі пра адну акцыю “У матулі — дачка і сын, у вобласці — новы грамадзянін”. Дапамагло нам грамадскае аб’яднанне “Беларускі саюз жанчын”. І месца было абрана адмысловае — акушэрскае аддзяленне Бярэзінскай раённай бальніцы. Да слова, летась у раёне нарадзілася 244 дзіцяці. Сярэдні ўзрост матуль — 27 гадоў. А сёлета гераіняй дня стала Марына Дасугава, якая нарадзіла першынца-сыночка вагой у 3280 грамаў. Першы ў гэтым годзе грамадзянін вобласці. Шчаслівая мама атрымала падарункі. Перад пацыенткамі і персаналам выступіў тэатр аднаго акцёра Бярэзінскай раённай бібліятэкі”.*

К

Віркаўскія Каляды: “куры”, “цыганы” і “Гарэзы”

Штогод я выязджаю на Стары Новы год у беларускую глыбінку, каб на ўласныя вочы пабачыць жывыя калядныя абрады. Ледзь не з першай вандроўкі імкнулася распавесці аб пабачанным на старонках СМІ. І цяпер ужо не адрозніш, што першаснае: навуковае даследаванне, збор інфармацыі для маніторынгу стану элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны, ці імкненне распавесці чытачам нешта цікавае.

Калядны гурт у Віркаве.

Сёлета збіралася ў Луку на Століншчыне, але ў апошні момант вырашыла паехаць у свой родны Клічаўскі раён, дзе ў Інвентар нематэрыяльнай культурнай спадчыны ўнесены дзіцячы калядны абрад “Куры”. Гэта абыход двароў, што здзяйсняецца 13 студзеня дзецьмі школьнага ўзросту, якіх у Віркаве засталося ўсяго 14 дзяцей. Налета большасць з іх скончыць школу ў суседнім Пярэкаллі і раз’едзецца. Хто тады будзе хадзіць “у куры”? Пакуль невядома.

Сёлета Віркаў наведалі таксама ўдзельнікі фальклорнага гуртка “Гарэзы” з Клічава. З імі прыехалі дырэктарка Цэнтра дадатковай адукацыі Ала Пятроўская, выкладчыца Жанна Ачыновіч і метадыстка Вераніка Коўрык, а таксама дырэктар Клічаўскага цэнтра турызму Аляксей Шумскі. Прыемна было бачыць такую цікавасць да вясковага абраду з боку жыхароў райцэнтра. Як патлумачыла Жанна Ачыновіч, яе навучэнцы вельмі хацелі паглядзець на сапраўднае калядаванне і самі пакалядаваць. “Гарэзы” хадзілі з уласнай калядная праграмай, хаця ведаюць і песню віркаўскіх “курэй”. Адбыўся ў нейкім сэнсе абмен вопытам.

Таксама ў гэты вечар па вёсцы хадзіў гурт калядных “цыганоў” на чале з кіраўніцай віркаўскага клуба Жаннай Васьковіч, якая сама пераапранулася ў цыганку. Нядаўна клуб “перасялілі” з аварыйнага будынка ў бібліятэку. Тут працуе краязнаўца Надзея Дубень, якая ўдзельнічае ў гурце “цыганоў” у ролі Паненкі. З ёй у пары — Пан. Таксама парныя персанажы — Цыган з Цыганкай, Малады з Маладой. Усе яны віншуюць гаспадароў і танчаць. З імі ходзіць Механоша.

Назад у Клічаў “Гарэзы” з’язджалі задаволенымі і стомленымі, з поўнай торбай пачастункаў ад віркаўскіх гаспадароў. “Кур” і “цыганоў” вяскоўцы таксама, канечне, не пакрыўдзілі.

Алена ЛЯШКЕВІЧ,
малодшы навуковы супрацоўнік Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі

Трэці з гітарнага куфэрка

Чаму Віктар Смольскі — наш чалавек у Нямеччыне — не стаў бы будаваць трасу для “Формулы-1“ у Беларусі?

Напэўна, было б правільным паставіць гэтага музыканта першым у шэрагу ягоных калегаў, у якіх я браў інтэрв’ю, паколькі і ў свеце гітарнага мастацтва ён вядомы больш, ды і валодае на “выдатна” не толькі гэтым інструментам. Але так ужо выйшла, што меў зносіны я з ім пасля гутарак з Валерыем Дзідзюлем і Ірынай Ігнацюк.

Алег КЛІМАЎ


Гурт Almanac. Віктар — другі справа.

ЁСЦЬ ТАКАЯ КРАІНА — БЕЛАРУСЬ

— Летась не стала вашага бацюшкі — выдатнага беларускага кампазітара Дзмітрыя Смольскага, здабытка айчыннай культуры. Чаму самаму галоўнаму ён вас навучыў у творчасці?

— Рабіць усё з поўнай аддачай, бескампрамісна, займацца тым, што падабаецца. Рабіць такую музыку, якую самому прыемна слухаць, а не падладжвацца пад моду, камерцыю. Быць у творчасці шчырым. Аддавацца ёй на ўсе сто працэнтаў, каб пасля ніколі не было сорамна за зробленае.

— Дзмітрый Браніслававіч вельмі добразычліва ставіўся да таго, што яго сын іграе рок. Больш за тое, у вас ёсць сумесныя работы ў гэтым жанры. Што яму падабалася ў ім?

— Бацька стаў мяне падтрымліваць усім, чым мог, убачыўшы, што я вельмі сур’ёзна стаўлюся да заняткаў на гітары. Калі мы пачалі ствараць сумесныя творы, напрыклад, “Сімфонію для электрагітары”, яго зачапіла ў маёй музыцы менавіта рокавая энергія. Ён часта прысутнічаў на маіх канцэртах, і яму вельмі падабалася атмасфера ў зале. Калі ў яго пыталіся, ці не занадта гучна, ён адказваў, што гэтая музыка павінна такой быць, таму што такая энергія якраз патрабуе пэўнай гучнасці. Ён добра ставіўся і да року, і да джаза, і ў прынцыпе да любой музыкі, якая зроблена прафесійна.

— Вы шмат працавалі з рознымі сімфанічнымі аркестрамі, у тым ліку з Дзяржаўным акадэмічным сімфанічным аркестрам Рэспублікі Беларусь. Зыходзячы з якіх крытэраў падбіралі той ці іншы калектыў для ўвасаблення вашых задумак?

— Як правіла, з маладзёжнымі аркестрамі працаваць было прасцей і цікавей. Так, зборны склад мінскіх музыкантаў з розных аркестраў і барселонскі маладзёжны філарманічны аркестр падыходзілі мне лепш за ўсё. Класічныя калектывы больш кансерватыўныя, яны не заўсёды могуць граць рок-музыку. Збольшага таму, што аркестравыя музыканты не любяць граць роўна, не любяць музыку, якую я раблю. А многія маладыя музыканты самі слухаюць “цяжкую” музыку, разумеюць яе, любяць і, адпаведна, аддача ад іх выканання зусім іншая.

— Мне здаецца, цалкам лагічным быў бы праект, скажам, рок-опера, якую вы стварылі б, грунтуючыся на беларускім гістарычным матэрыяле.

— У цяперашні час на сур’ёзныя канцэптуальныя праекты асабліва няма попыту. Людзі сёння не слухаюць музыку ў такім фармаце. Заключыць кантракт на выпуск рок-оперы вельмі цяжка, паколькі яе будзе нялёгка рэалізаваць. Хаця мне было б вельмі цікава ўзяцца за такі праект, можа быць, калі-небудзь, нягледзячы ні на што, я гэта і зраблю. Тым больш, што ў Беларусі сапраўды хапае цікавага гістарычнага матэрыялу. У мяне нават была думка зрабіць рок-оперу на базе оперы бацькі “Сівая легенда”. Але я выдатна разумею: гэта вельмі цяжка прапанаваць на Захадзе. Не кажучы ўжо пра тое, што мне пастаянна даводзіцца распавядаць людзям у Еўропе, дзе на карце гэтая Беларусь. Як ні дзіўна, пра існаванне нашай краіны, якая знаходзіцца дастаткова недалёка, многія тут нават не ведаюць. Адпаведна, з яе гісторыяй таксама мала хто знаёмы.

Даведка

Віктар СМОЛЬСКІ, 48 гадоў. Нарадзіўся ў Мінску. У 1984 годзе скончыў сярэднюю спецыяльную музычную школу пры Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі (цяпер — Рэспубліканская гімназія-каледж пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі) па класе віяланчэлі. У 1989 годзе — Мінскае музычнае вучылішча імя Міхаіла Глінкі (цяпер — Мінскі дзяржаўны музычны каледж імя Міхаіла Глінкі) па класе гітары. У 1986 годзе ўвайшоў у склад маладзёжнай студыі ансамбля “Песняры”. У 1988-м заснаваў сталічны гурт “Инспектор”. Быў удзельнікам такіх вядомых у свеце метал-музыкі калектываў, як Mind Odyseey і Rage. Лідар гурта Almanac, мультыінструменталіст, кампазітар, прадзюсар, педагог, аўтагоншчык. З 1993 года жыве ў Германіі.

АД СТАРОГА ЧУЮ

— На нейкім этапе вы відавочна перараслі агульны ўзровень Rage — гурта, увогуле, для кагосьці культавага...

— У нейкі момант мне сапраўды стала сумна з Rage. Я хацеў развівацца далей і эксперыментаваць з больш прафесійнымі музыкантамі, пашыраць свой музычны кругагляд. Таму і стварыў уласны гурт Almanac і працягваю браць удзел у іншых праектах. Гэты музычны абмен вельмі важны для майго творчага росту. Таму што чым больш вопытным ты становішся ў прафесійным плане, тым цікавей вучыцца чамусьці новаму. Адчыняецца ўсё больш дзвярэй, пачынаеш разумець тое, што раней зразумець было цяжка, гарызонты магчымасцяў пастаянна пашыраюцца.

— Ці прынята за мяжой аднаму гітарысту тэлефанаваць іншаму і нешта такое яму гаварыць: “Стары, я б у вашым апошнім альбоме на тваім месцы зрабіў бы так і так”? Альбо: “Быў на вашым учарашнім канцэрце, вось па гэтых пасажах у мяне да цябе пытанні”?

— Бывае, але рэдка. У асноўным, музыканты маюць зносіны на фестывалях, на канцэртах кантактаў значна менш. Там усе заняты сваёй справай і не папраўляюць адзін аднаго, бо ў кожнага музыканта ўласны стыль выканання. Дыялог нараджаецца, калі граеш разам ці робіш сумесныя праекты. Я, напрыклад, часта ўдзельнічаю ў музычных сэйшанах, дзе мы супольна імправізуем і джэмім. Гэта самыя лепшыя зносіны, таму што пасля якраз узнікае шмат пытанняў і з’яўляецца маса новых творчых ідэй.

ДЗВЕ РАДЗІМЫ

— Сапраўдным аматарам хард-рока вядома, што Віктар Смольскі яшчэ і аўтагоншчык. Быў бы ў вас вагон грошай, інвеставалі б іх у будаўніцтва трасы “Формула-1” у Беларусі?

— Каб я ўсур’ёз задумаўся пра гоначную трасу ў Беларусі, то “Формулу-1” не будаваў бы — як гонка яна стала даволі сумнай. Зрабіў бы трасу для ралі-кроса, які аб’ядноўвае класічнае ралі і кальцавыя гонкі. Для гледачоў гэта самая відовішчная, а для кіравання — адна з самых цяжкіх трас. Ралісты для мяне — гоншчыкі № 1. У звычайным ралі вельмі цікава прымаць удзел, але яго нецікава глядзець. А ралі-крос набірае ўсё большую папулярнасць у заўзятараў на Захадзе. Каб нешта падобнае задумалі зрабіць у Беларусі, з велізарным задавальненнем паўдзельнічаў бы ў такіх гонках. Акрамя гэтага, новы трэнд на Захадзе — аб’ядноўваць музыку і спорт. Усё часцей “жывыя” канцэрты праводзяць на аўтамабільных шоу. Я лічу, што такі фармат стаў бы папулярны і ў Беларусі.

— Сёй-той з беларускіх музыкантаў шукаў вашай падтрымкі, спрабуючы “раскруціцца” на Захадзе...

— ...але пакуль з гэтага нічога добрага не выйшла. Адны не адолелі нагрузку, бо каб працаваць у той жа Германіі, трэба ўвесь час знаходзіцца там, што не так проста з-за візавых праблем. Іншыя не выканалі складаную прававую кантрактную сістэму. У апошнія гады прабіцца на Захадзе стала значна цяжэй, паколькі няма той фінансавай падтрымкі, якую забяспечвалі раней гуказапісвальныя фірмы. Ды і беларускі рынак не асабліва ім цікавы, паколькі кампакт-дыскі там амаль не прадаюцца. На Захадзе наогул несур’ёзна ставяцца да нашых музыкантаў, таму што дрэнна іх ведаюць. Некаторыя беларускія гурты спрабуюць выязджаць за мяжу і там працаваць, але за якія-небудзь паўгода ўскочыць у сучасны заходні шоу-бізнес практычныя нерэальна. Хоць магчымасць такая, у тэорыі, ёсць ва ўсіх. Важна, з якой аддачай людзі ўкладваюцца ў працу. Усе чамусьці думаюць, што на Захадзе гуказапісвальныя кампаніі іх адразу ж ацэняць высока, выпусцяць альбом, дадуць грошы на тур. У рэальнасці, каб зачапіцца ў тым бізнесе, трэба ўвесь час знаходзіцца тут, быць навідавоку, пастаянна граць на канцэртах, ездзіць з імі, заваёўваць новых фанатаў, заводзіць карысныя знаёмствы з іншымі музыкантамі, з прадзюсарамі і быць вельмі актыўнымі ў інтэрнэце. Натуральна, усё гэта патрабуе сур’ёзных часавых і фінансавых укладанняў.

— Ёсць нешта такое, што падштурхнула б вас вярнуцца на радзіму назусім?

— Пражыўшы большую частку жыцця ў Германіі, магу сказаць, што ў мяне ўжо дзве Радзімы. Мой менталітэт моцна памяняўся, таму ў Германіі адчуваю сябе нядрэнна. Але я б з вялікім задавальненнем прыязджаў у Беларусь значна часцей...

К

Фігура, замры!

“К” сабрала фотакалекцыю фігур фізкультурнікаў у Мінску. Экспанатаў хопіць на выставу. Але ці патрэбны гораду парк савецкай скульптуры?

Спартсмен у двары сталічнага політэхнічнага каледжа на праспекце Незалежнасці.

ЗНІКАЮЧЫЯ ВІДЫ

Гарніст, дзеці з футбольным мячом, дзяўчынка з кнігай, тэнісіст, плывун, лыжнік. Такімі фігурамі ўпрыгожвалі Мінск у 1930-я і пазней — у 1950 — 1960-я гады. Галоўная тэма савецкай паркавай скульптуры — чалавек ідэальны. Прыклад для пераймання, узведзены на п’едэстал. Глядзіш і верыш: і на самой жа справе “бодры і вясёлы!” Адзін з персанажаў таго ілюзорнага свету — скульптура “Дзяўчынка на самакаце” на вуліцы Стаханаўскай у Мінску. Яшчэ паўгода таму выгляд у яе быў хваравіты. Аднавіць работу вырашылі жыхары раёна. КОТОС-46 (калегіяльны орган тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання) заняў прызавое месца ў гарадскім аглядзе-конкурсе і атрымаў прэмію. Гэтыя грошы было вырашана патраціць на выратаванне скульптуры, якая даўно стала сімвалам двара.

— Некаторыя дэталі давялося аднаўляць з нуля, — распавядае рэстаўратар Валерый Дудко. — Масляная фарба адлушчвалася. Там быў і жоўты, і ружовы — усе адценні, якія могуць замяніць колер скуры.

Да аперацыі па выратаванні “Кагосьці на самакаце” далучыліся неабыякавыя жыхары суседніх дамоў. Спачатку “блыталіся ў сведчаннях”. Ці то хлопчык, ці то дзяўчынка? Хто ж стаіць на самакаце, стала зразумела, калі пачалася рэстаўрацыя. Але ні намёку на анатамічныя падрабязнасці. На галаве скульптуры, прыкладна там, дзе дзяўчынкі носяць хвосцікі, тырчалі металічныя штыры. Рэшткі дроту і падказалі майстру, што не хапае... прычоскі. Якой менавіта? Меркаванні разышліся. Адны казалі: “Дакладна памятаю — былі касічкі”. Іншыя: “Не, хвосцікі”.

— Скульптура зразумелая, вобраз яркі. І ў яе столькі абаронцаў знайшлося ў двары. Жыхары спачатку абураліся: “Што вы тут робіце? Куды яе звозіце?” А потым разабраліся і пачалі дапамагаць, спрабавалі ўзгадаць, як “Дзяўчынка на самакаце” выглядала першапачаткова, — кажа рэстаўратар Валерый Дудко.

Адноўленая “Дзяўчынка на самакаце” на вуліцы Стаханаўскай.

Так яна выглядала да “выратавання”.

НАІЎНАЯ І ЖЫВАЯ

Савецкая паркавая скульптура рэдка прэтэндуе на эксклюзіў. Адны і тыя ж сюжэты паўтараюцца з горада ў горадзе.

— Не сустракаў дакладных аналагаў скульптуры “Дзяўчынка на самакаце”. Але гэта не значыць, што іх няма. Падобны вобраз ёсць у фарфоравай пластыцы, у кніжнай графіцы, — расказвае Валерый. — Даведацца, як скульптура выглядала першапачаткова, мог бы дапамагчы фотаздымак. Шкада, што такога не знайшлося. Каб гаворка ішла пра рэстаўрацыю музейнай рэчы, то пакінуў бы яе, як ёсць. Не стаў бы аднаўляць прычоску. Але тут іншая сітуацыя, і давялося пайсці на кампраміс. Усё ж такі гэта дзіцячая пляцоўка. Само месца патрабавала завершанасці.

— Савецкую паркавую скульптуру аб’ядноўвае іранічны тэрмін “гіпсавы рэалізм”. Гіпс сам па сабе недаўгавечны. Няма адчування, што гэтыя работы ўжо адыгралі сваю ролю?

— Асноўным матэрыялам быў усё ж такі не гіпс, а бетон. А ён якраз жыццеўстойлівы. Нядаўна рэстаўраваў тры паркавыя скульптуры, якія стаялі на тэрыторыі дзіцячага аздараўленчага летніка. Ясна, што ўсе гэтыя рэчы казённыя. І шкада, што мастакі рэалізоўвалі свае магчымасці такім вось чынам. Але ў выканальніцкім плане — няма пытанняў. Гэта яркія ўзоры манументальнай прапаганды. Цікавыя савецкія артэфакты.

Зразумела, што бронза — дарагі, стратэгічны матэрыял. І траціць яе на скульптуру накшталт “Дзяўчынкі на самакаце” не было магчымасці. Яна выканана з бетону з дабаўкай мармуровай крошкі. Такая тэхніка не прадугледжвае афарбоўкі. Таму вярнуў рабоце белы колер.

— Стылізацыя пад мармур?

— Так і ёсць. Савецкая скульптура — спроба стварыць новую рэальнасць. Узор прыгажосці — Антычнасць. У 2008 годзе ўдзельнічаў у рэстаўрацыі скульптур Палаца прафсаюзаў. Настолькі выразныя вобразы! Яны былі схаваныя пад тлустым слоем тынку. Але мы “знялі гэтыя футры”. І раскрылі такія партрэты! Падумаў тады: “Ці можна сёння сустрэць гэтых персанажаў у горадзе?” Але не, выраз твару, як у герояў савецкага кіно 1950-х.

— Сёння паркавая скульптура таго часу — знікаючы від. Усе гэтыя піянеры, піянеркі, спартсмены — смецце, якое не шкада? Ці не смецце і ўсё ж такі шкада?

— Па адукацыі я скульптар, скончыў Беларускую акадэмію мастацтваў. І да таго часу, пакуль не заняўся рэстаўрацыяй, не звяртаў увагі на савецкую скульптуру. Для мяне яе быццам не існавала. Але цяпер спрабую выключыць у галаве гістарычны шум і паглядзець, як выкананыя гэтыя работы. І бачу прыгожую пастаноўку фігуры, дакладнае пападанне ў прапорцыі. Зараз кажу пра манументальныя рэчы, у рэстаўрацыі якіх удзельнічаў. Гэта, як ужо казаў, скульптуры на фасадах Палаца прафсаюзаў, а таксама Нацыянальнага мастацкага музея і беларускага павільёна на тэрыторыі ВДНГ у Маскве (пяць фігур 1954 года адноўлены спецыялістамі майстэрняў “Белрэстаўрацыі” ў 2016 годзе — **“К”**).

Лыжніца на вуліцы Караткевіча ў Мінску.

“Дзяўчынка на самакаце”, пра якую мы гаварылі, вельмі мілая рэч. Бетон дыктуе скульптару пэўную пластыку. Як правіла, няма дробных дэталяў, усёй гэтай барочнай разьбы, завітушак. Работа выканана вельмі проста. Але яна прыгожая гэтай сваёй немудрагелістасцю. І поўная энергіі. Глядзіш — і адчуванне: сапраўды ж едзе.

ПАРК САВЕЦКАЙ СКУЛЬПТУРЫ

У сучасным горадзе скульптура кшталту “Дзяўчынкі на самакаце” глядзіцца згублена. Час піянераў тых гадоў сышоў, а іх бетонныя фігуры растрэскаліся.

Падчас рэканструкцыі парка Перамогі архітэктары “Мінскпраекта” прапаноўвалі зберагчы для гісторыі найбольш цікавыя экзэмпляры. І стварыць экспазіцыю пад адкрытым небам на востраве Камсамольцаў. Уздоўж прагулачнай сцежкі па перыметры выспы меркавалася ўсталяваць тыповыя для свайго часу работы на тэму “просты савецкі чалавек”. Персанажы, асуджаныя апынуцца на сметніку, маглі б стаць экспанатамі музея пад адкрытым небам.

— Падчас рэканструкцыі парка Перамогі ўлічвалі як тэматыку музейна-паркавага комплексу, так і складзены там ландшафт, — расказвае галоўны архітэктар праекта рэканструкцыі музейна-паркавага комплексу “Перамога”, спецыяліст УП “Мінскпраект” Ганна Аксёнава. — Напрыклад, адна з выспаў Камсамольскага возера названа “Птушыная”. Тут мы мелі справу не проста з ландшафтам, а з месцам знаходжання птушак і іншых прадстаўнікоў фаўны.

Найбуйнейшую выспу акваторыі мы назвалі — “Камсамольская”. Была задума адкрыць на яе тэрыторыі экспазіцыю скульптуры сацрэалізму, ці Парк савецкай скульптуры. Для турыстаў і маладых людзей, якія нарадзіліся пасля распаду Саюза, такая выстава ўспрымалася б як экзотыка. Цікавы аб’ект прыцягнення мог бы атрымацца.

Але ажыццявіць ідэю тады не выпала. Хаця само месца стала выкарыстоўвацца для выставы. Толькі не гістарычнай, а сучаснай. Летам тут можна ўбачыць мудрагелістыя скульптуры і прасторавыя аб’екты ўдзельнікаў праекта “Арт-астравы”.

Ірына ЮДЗІНА
Фота Таццяны СВІРЭПЫ

Словы пра Раю Баравікову

Мастак і літаратар Адам ГЛОБУС працягвае цыкл сваіх сяброўскіх нарысаў пра вядомых беларускіх творцаў.

ЯНУАРАВІЧ

З паэткай Баравіковай я пазнаёміўся ў аўтобусе "Мінск-Мсціслаў". Ехаў працаваць рэстаўратарам у паўразбураны кармеліцкі касцёл, а Рая ехала ў камандзіроўку ад бюро прапаганды — каб пачытаць вершы звычайным мсціслаўцам. У Раі быў спадарожнік — пісьменнік і функцыянер з імём па бацьку Януаравіч. Я пра яго мала што ведаю. Адно дакладна: калі нешта кепскае рабілася ў пісьменніцкім асяроддзі, усе каламбурылі: "Улукшылі і ўпрокшылі!" Акрамя яго, тутэйшыя пісьменнікі кепска і зайздросліва ставіліся яшчэ і да аднаго дзіцячага паэта.

Баравіковай было крыху сумна з паважаным Януаравічам, таму яна ўзрадавалася маёй прапанове сесці побач і пагаварыць пра жыццё-быццё ды паэзію. Мы прагаварылі ўсю тую доўгую дарогу. Перад развітаннем я запрасіў Раю ў свой паўразбураны касцёл.

Яна прыйшла. Блакітнавокая і модная — у дарагой джынсавай куртцы і дарагой джынсавай спадніцы. Я быў упэўнены, што Баравікова не прыйдзе, а калі і прыйдзе, дык з вусатым і сівым Януаравічам. Рая прыйшла без Януаравіча. Я гадзіны дзве расказваў беларускай паэтэсе пра барока, пра роспісы, пра вобраз Дзевы Марыі на мсціслаўскіх сценапісах.

З аўтобуснага знаёмства і экскурсіі ў касцёле пачалося маё доўгае сяброўства з выдатным чалавекам — Раісай Баравіковай. Шмат хто думае, што доўгае сяброўства пачынаецца са сваркі, а ў мяне з Баравіковай усё пачалося з запамінальнага летняга падарожжа ў рэйсавым аўтобусе.

ВІДАВОЧНАЕ

Рая Баравікова — прыгожая жанчына. Гэта відавочна. Ніхто не запярэчыць. Зробяць, як і даўней рабілі — зусім інакш. Замест таго, каб усхваляць таленавітасць, прывабнасць і прыгажосць паэткі Баравіковай, будзе падымацца на шчыт нешта іншае. Падобнае творыцца ў сацыяльных сетках: пад фотаздымкамі крыватварых і крывацелых пачварак пішуць, што яны маюць ачаравальную знешнасць. На кнігі графаманаў і крыкуноў выходзяць хваласпеўныя рэцэнзіі.

Чорт з імі. Лепей я пра лепшае. Баравікова мае выдатныя кнігі, прывабнасць і сумленне. Толькі гэта ўсё ёй не столькі дапамагала, колькі шкодзіла. Чыны, званні і ўзнагароды хапалі іншыя. Гарлапаністыя і нахрапістыя, хітраспрытныя і ўсюдыісныя, мужыкападобныя і няшчасныя атрымалі нашмат болей за Раісу Баравікову. Ёй жа і так добра! У яе блакітныя вочы і светлыя валасы, і ўся яна наскрозь светлая, ветлівая ды сонечная. Яе любяць мужчыны і юнакі. Ёй лёгка дыхаецца і лёгка пішацца нават пра слёзы кахання. Што ёй яшчэ трэба? Пыталіся — і не адказвалі!

Адказ просты. Раісе Баравіковай, як і ўсім, патрэбна адно — прызнаць відавочнае. З гэтым прызнаннем у людзей і ўзнікаюць цяжкасці. Большасць, як бачым, лягчэй пачне ўсхваляць пачварнае, чым казаць праўду пра таленавітае, светлае і прыгожае. У гэтым большасць не мае рацыі. Адназначна.

ПРЫГАЖОСЦЬ

Рая заўсёды ведала пра сваю адметную светласць і жаноцкую прывабнасць. Ведала — і старалася не прыніжаць уласнай прыроднай прыгажосцю іншых, менш прыгожых жанчын. Яны ўсё адно зайздросцілі, абгаворвалі, аблайвалі Раю. Яны пісалі мярзотныя лісты. Брыдкатварыя і крывадушныя бабы пісалі на Раю даносы і рассылалі іх паўсюль, куды можна рассылаць падобнае паскудства. Яны распускалі плёткі. Казалі, што паэтку Раю Баравікову выгналі з маскоўскага літаратурнага інстытута за п'янства і распусту. Казалі, што яна не любіць Радзіму і заўтра-паслязаўтра абавязкова з'едзе да сваякоў у Амерыку. Казалі, што яна кожны тыдзень заводзіць новага палюбоўніка. Рая праз гэта перажывала. Асабліва моцна перажывала, калі на яе нагаворвалі і яе аблайвалі былыя сяброўкі. Але перажыванні перажываннямі, а прыгажосць і светласць у Раіным абліччы не прападалі і не прапалі.

ЛАЯЛЬНАСЦЬ

Рая сябравала з рускім пісьменнікам Уладзімірам Максімавым, які стварыў і выдаваў літаратурны, палітычны і рэлігійны часопіс "Кантынент". Таму і запісалі яе ў дысідэнткі, залічылі ў ворагі савецкай улады і перасталі друкаваць. Першае, што забаранялася ў савецкім друку, — прозвішча. Баравікову забаранілі. Таму Рая сваю чарговую падборку лірычных вершаў падпісала іншым прозвішчам. Падпісала і даслала ў часопіс "Маладосць". Вершы зрабілі фурор, яны страшэнна спадабаліся ў рэдакцыі. Так спадабаліся, што Бураўкін з Аўрамчыкам вырашылі неадкладна з'ездзіць да новай беларускай геніяльнай паэткі. Прыехалі і пабачылі Раю Баравікову. Гэта падарожжа нейкім чынам выправіла сітуацыю, і забарону з Раінага прозвішча знялі. Толькі ўсё адно Баравікову не прынялі ў лаяльныя да савецкай улады паэткі.

ДВА ЧАМАДАНЫ

Сярод шматлікіх мужчын, захопленых светлынёю Раі, вылучаўся салодкагалосы пясняр. Ён меў шырокую вядомасць і безліч прыхільніц свайго надзвычайнага таленту, сваёй узорнай знешнасці і сваёй трывалай заможнасці. Толькі вось Рая не надта ім захаплялася. Аднаго разу яна дазволіла сабе нават засумнявацца ў прывабнасці спевака. Ён пакрыўдзіўся як падлетак. Дарэчы, ён і выглядаў заўжды русагаловым, сінявокім, здзіўленым падлеткам.

У якасці доказаў уласнай прыгажосці спявак прынёс і паказаў Баравіковай два вялізныя чамаданы, поўныя лістоў і паштовак з прызнаннямі ў каханні. У яго і сапраўды было мора адданых прыхільніц, а ён выбраў Раю і праз гэта адпакутваў, бо нават два чамаданы дзявочых лістоў не прымусілі яе застацца з песняром.

ГОЛАС

У паэта мусіць быць адметны голас. У Раі Баравіковай ёсць незвычайнасць і адметнасць у голасе. Ён эратычны, цёплы, мяккі. Ён зачароўвае і заварожвае. Ім напоўнены яе вершы. Ніводная беларуская паэтка не мела і не мае падобнага голасу. Нават выдатныя творцы саступаюць Баравіковай. У Разанава голас драўляны і цацачны, у Булыкі — дзявоцкі, а часам і зусім дзіцячы, у Галубовіча — звычайны... Толькі з такім надзвычайным голасам, як у Баравіковай, паэтка можа выдаць зборнік лірыкі пад назвай "Каханне" — і не памыліцца.

ШЧАСЦЕ

Шукаў у кніжках Раі Баравіковай апісанне жаноцкага шчасця. Знайшлося такое:

Пакахаю Васю-мельніка,
будзе жорны ён круціць,
за сцяной густога ельніка
мілай пацеркі дарыць...

Калі Роберт Бёрнс нарадзіўся б жанчынай, пра жаноцкую радасць ён пісаў бы нешта падобнае: з млынам, з ельнікам ды пацеркамі.

БАРДАЧОК

Тэледраматург Максім Клімковіч убачыў у бардачку грузавіка, які вывозіў кнігі з Дома друку, зборнік вершаў Раі Баравіковай "Каханне". Кожны раз, бачачы гэты грузавік, ён прапаноўваў прысутным адгадаць, якую кніжку трымае ў бардачку шафёр. Паперадзе ўсяго называлася баявітая фантастыка, за ёй ішло фэнтазі, потым — дэтэктывы і ваенныя прыгоды. Не забываліся кнігі пра рыбалку і рамонт аўтамабіляў. Але ніхто і блізка не называў зборнікі лірыкі. Некалькі разоў людзі не верылі Клімковічу і хадзілі правяраць. У бардачку правяралы бачылі "Каханне" Раі Баравіковай. Некаторыя з іх нават перапытвалі шафёра: ці не падклалі яму гэткую незвычайную кнігу? Шафёр смяяўся і тлумачыў, што яму проста падабаецца Рая Баравікова і яе зборнік "Каханне".

Некалі мастак Мартынчык мне з гонарам за свой Лондан казаў: "Уяўляеш, там нават будаўнікі на абедзенным перапынку чытаюць Альбера Камю. Неяк яны селі палуднаваць. Дасталі кнігі. Чытаюць. Я пацікавіўся... Камю!" Так што ў Лондане — Камю, а ў Мінску — Баравікова. Між іншым, з Баравіковай у Мінску мне нават больш утульна.

"СЛОН"

Добра, калі ў пісьменніка ёсць надзейны і таленавіты публікатар. Ты нешта нейкае сабе напішаш, а ён твой тэкст акуратна адрэдагуе і хутка надрукуе. Майму першаму апавяданню "Слон" пашанцавала, яно легла на стол да Раі Баравіковай і праз які тыдзень з'явілася на газетнай паласе. У хуткім часе "Слон" выйшаў па-руску і па-грузінску. Пасля "Слана" Баравікова надрукавала шмат маіх вершаў і апавяданняў. Яна не пабаялася друкаваць і шчырыя татавы дзённікі, якія я рыхтаваў да публікацый пасля ягонай смерці. Як пісьменніку мне моцна пашанцавала з публікатарам. І не толькі мне, бо Рая Баравікова ў часы свайго рэдактарства выпусціла ў свет шмат добрых беларускіх літаратурных тэкстаў.

СЕЛЯШЧУК

Паэтка Рая Баравікова сябравала з графікам Селешчуком. Ён рабіў аздабленне яе кніжак, яна прысвячала яму вершы. Сяброўства іх скончылася раптоўна. Яно перарвалася ў час тэлефоннай размовы. Рая затэлефанавала Селешчуку, каб папрасіць яго зрабіць вокладку і малюнкі да новага зборніка "Адгукнуся голасам жалейкі". Ён спытаў, ці плануецца выданне ў палепшанай паліграфіі. Зборнік быў запланаваны ў самым сціплым звычайным варыянце. "Я цяпер толькі палепшаныя выданні аздабляю. Калі запланаваць тваю кнігу ў палепшаным варыянце, тады і звані..." Паэтка Баравікова больш ніколі не тэлефанавала мастаку Селешчуку.

РУЖЫ

Ёсць у мяне звычка — перадорваць букеты. Няўтульна я сябе адчуваю з кветкамі ў руцэ. Чым хутчэй ад іх пазбаўлюся, тым мне лягчэй. Выкінуць букет не магу, яго дарылі ад усяго сэрца. Букет — свае-асаблівая ўзнагарода. Якое тут выкіданне? Таму як толькі атрымліваю букет, адразу пачынаю шукаць вачыма жанчыну, якой варта перадарыць кветкі... Адзін з самых прыгожых сваіх букетаў я перадарыў Баравіковай. Калі мяне ўзнагародзілі літаратурнай прэміяй і далі ружы, я паглядзеў у залу, дзе сядзела больш як сотня беларускіх пісьменнікаў і пісьменніц, і выбраў Баравікову. Яна выдатна глядзелася з букетам. Дарэчы, што б хто ні казаў, а жанчына з букетам выглядае больш натуральна за мужчыну з кветкамі. У руках мужчыны кветкі нагадваюць не столькі пра ўрачыстасць, колькі пра жалобу. Таму я і перадаю свае кветкі ў жаночыя рукі.

Адам ГЛОБУС,
мастак, літаратар

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, вул. Леніна, 20.
Тэл.: 327 45 62.
Экспазіцыі:
■ "Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст.";
■ "Мастацтва Беларусі XIX — пач. XXI стст.";
■ "Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.";
■ "Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.";
■ "Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.";
■ "Мастацтва краін Усходу XIV — XX стст.".
Выставы:
■ Выставачны праект **"Святыя непадзеленай Царквы"** — да 20 лютага.
■ Выстава **"Валерый Шкаруба. Жывапіс"** — да 21 студзеня.
■ Юбілейная выстава народнага мастака Рэспублікі Беларусь Віктара Грамыкі (прымеркавана да 95-годдзя мастака) — да 2 лютага.
■ Выстава **"Паэтыка пейзажаў Сямёна Дамарада"** — да 11 лютага.

Філіялы музея
МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І ПАЛОВЫ XIX ст."
г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 327 88 78.
Пастаянныя экспазіцыі:
■ **"Інтэр'еры шляхецкай сядзібы"**.
■ **"Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча"**.
■ **"Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст."**.
■ Выстава акварэлі Ларысы Стрыжак і Наталлі Харольскай **"Мы любім кветкі..."**

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ
Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 69.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Жаночы сусвет"** — да 11 сакавіка.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 327 43 22.
Экспазіцыі:
■ Абноўленая экспазіцыя **"Старажытная Беларусь"**.
■ "Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы".
■ Бестэрміновая акцыя **"Адзіны білет"**, якая дазваляе мінчанам і гасцям сталіцы наведаць музей і яго шэсць філіялаў, набыўшы ўсяго адзін білет у любым з іх.
■ Аўтарскі праект Ахрэма Белабровіка **VKL3D**.
■ Акцыя **"Вольнае пяніна"** — кожны дзень з 16.00 да 19.00.
Выставы:
■ Выстава **"Беларусь: адраджэнне духоўнасці"**.
■ Выстава **"Ад рымскага дэнарыя да беларускага рубля"**.
■ Выстава твораў Настассі Балыш **"Таямніцы святла"** — да 17 лютага ў музейнай прасторы "Галерэя".
■ Выставачны праект **"АРТефакты игры"** — да 28 студзеня.
■ Прэзентацыя аднаго з найбольш знакавых набыткаў мінулага года — памятных манет серыі **"Шлях Скарыны"** — 25 студзеня. Пачатак а 17-й.

Філіялы музея
ДОМ-МУЗЕЙ І З'ЕЗДУ РСДРП
г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а. Тэл.: 290 68 47.
■ **Абноўленая экспазіцыя**, прымеркаваная да 100–годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі (залы дапоўненыя новымі прадметамі амаль з усіх фондавых калекцый музея).
■ Экспазіцыйны праект **"Мінск 1917"**, прысвечаны гісторыі горада ў рэвалюцыйны 1917 год — да 11 сакавіка.

МУЗЕЙ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ
г. Мінск, вул. К.Маркса, 38.
Тэл.: 327 46 11.
■ Пастаянная экспазіцыя.

МУЗЕЙ ПРЫРОДЫ І ЭКАЛОГІІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 327 06 33.
Экспазіцыі:
■ "Сезонныя змены".
■ "Вадаёмы і насельнікі прыбярэжных раслін".
■ "Хвойны тып лесу і насельнікі змяшанага лесу".
■ "Насельнікі ліставога і змяшанага лесу".
■ "Ахоўныя прыродныя ўчасткі, рэдкія віды жывёл".
■ Выстава **"Жывыя цмокі"** — да 25 лютага.
г. Мінск, вул. Казінца, 117 (будынак кінатэатра "Электрон").
Тэл.: +37529 123 60 53.
■ Выстава **"Сафары парк"**.
■ Атракцыён **"Стужачны лабірынт"**.
■ Атракцыён **"Лазерны квэст"**.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ТЭАТРАЛЬНАЙ І МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ
г. Мінск, Музычны зав., 5.
Тэл.: 220 26 67.
Пастаянныя экспазіцыі:
■ "Вытокі тэатральнай і музычнай культуры на беларускіх землях"; "Музычная і тэатральная культура Беларусі ў X — XIX стст."; "Беларуская музычная культура XX ст."; "Тэатральная культура Беларусі XX ст.".
■ Выстава дзіцячай творчасці **"Калядныя замалёўкі — 2017"** — да 21 студзеня.
■ Выстава **"Легенда беларускай оперы"** (да 90–годдзя з дня нараджэння рэжысёра оперы, народнага артыста Беларусі С.А. Штэйна) — да 11 лютага.

У МІНСКУ ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" МОЖНА НАБЫЦЬ У НАСТУПНЫХ КРОПКАХ:

МАГАЗІНЫ "БЕЛСАЮЗДРУК"
● **Падземны пераход ст.м. "Пятроўшчына".**
● **Падземны пераход ст.м. "Плошча Перамогі".**
● **Праспект Незалежнасці, 44.**
● **Вуліца Валадарскага, 16.**

КІЁСКІ "БЕЛСАЮЗДРУК"
● **ст.м. "Няміга", вул. М. Багдановіча.**
● **Праспект Пераможцаў, 5.**
● **Вуліца Рабкораўская, 17.**
● **Праспект Незалежнасці,168, В.**
● **Вуліца Лабанка, 2.**

ГАСЦЁЎНЯ УЛАДЗІСЛАВА ГАЛУБКА
г. Мінск, вул. Старавіленская, 14. Тэл.: 286 74 03.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Персанальная выстава жывапісу Сняжаны Віцецкай **"Час шукаць"** — да 28 студзеня.
Майстар-класы:
■ Музейныя заняткі **"Тэатральная лялька"** для дзяцей 5+.
■ Інтэрактыўныя музейныя заняткі **"Асновы акцёрскага майстэрства"** для дзяцей ад 5 да 10 гадоў.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА КІНО
г. Мінск, вул. Свярдлова, 4.
Тэл.: 327 10 75.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ **"Асаблівая фатаграфія"** (першая выстава Секцыі аналагавай фатаграфіі Беларускага аб'яднання фатографаў) — з 22 студзеня да 18 лютага.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ
г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8.
Тэл: 327 11 66; 203 07 92.
Музей працуе: пн. — выхадны, аўт. — нядз. — ад 10-й да 18-й, сер. — ад 12-й да 20-й.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Часовая экспазіцыя **"У баях за Айчыну. Дзейнасць спецгруп НКУС-НКДБ СССР-БССР на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. 1941 — 1944 гг."** — да 31 студзеня.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"
г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19.
Тэл.: (8–01770) 2 06 60, 2 06 02; +37529 551 80 51, + 37529 190 31 49.
Палацавы ансамбль
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Гарнітурная лялька і кабінетная бронзавая скульптура"** з калекцыі Мікалая і Алены Байрачных — да 4 лютага.
■ Гістарычны квэст **"Таямніцы і загадкі палаца Радзівілаў"**. Па папярэдніх заяўках.
Сектар экскурсійнай і інфармацыйнай дзейнасці
Вул. Гейсіка, 1.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Дуэт"** з калекцый майстроў выцінанкі Алены Шаліма і Наталлі Гамаюнавай.
Ратуша Вул. Савецкая, 3.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Квэст **"Выхадкі старога захавальніка"**. Па папярэдніх заяўках.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"
г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць.
Тэл.: (8–01596) 2 82 91, (8–01596) 2 82 70.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Тэатралізаваная экскурсія **"І зноў ажываюць паданні"**.
■ Экскурсія з элементамі дэгустацыі **"У госці да Пане Каханку"**.
■ Дзіцячая тэатралізаваная экскурсія **"Чароўная гісторыя ў Мірскім замку"**.
■ Музейныя заняткі.
■ Музейная фотапляцоўка.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА
г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5.
Тэл.: 294 91 96.
Экспазіцыі:
■ **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць"**.
■ Экспазіцыя **"Склеп"** на сядзібе Якуба Коласа.
■ Тэматычныя экскурсіі і лекцыйныя заняткі.
■ Тэатралізаваныя прадстаўленні паводле беларускіх народных казак.
■ Музейныя майстар-класы і заняткі.
■ Мультымедыйны комплекс **"Чалавек. Асоба. Час"**.
■ Пешая экскурсія **"Мясцінамі Коласа ў Мінску"**.
■ Інтэрактыўныя праграмы для сямейных наведвальнікаў, квэст-гульня **"Таямніцы дома Песняра"**.
Акцыі:
■ **"Самы лепшы дзень"** (дзень нараджэння ў музеі).
■ Віншаванне ад музея, фотасесія **"У дзень вяселля — у музей!"**

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ
г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4.
Тэл.: 327 78 66.
Экспазіцыі:
■ Пастаянная экспазіцыя **"Шляхі"** з праглядам роліка ў 3D-фармаце і інтэрактыўнай зонай для дзяцей **"Хлопчык і лётчык"**, галаграфічным тэатрам.
■ Інтэрактыўныя музейныя праграмы **"У пошуках папараць-кветкі"**, **"Вячоркі"**.
■ Фотавыстава Уладзіміра Сцяпана **"Паштоўкі з вёскі"** — да 24 студзеня.
■ Выстава **"Yiwarra Kuju — маршрут Кэнінга: мастацтва абарыгенаў пустыні Заходняй Аўстраліі"** — з 26 студзеня да 14 лютага.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА МІНСКА
г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.

Філіялы Музея гісторыі горада Мінска
ГАРАДСКАЯ МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ ТВОРАЎ Л.Д. ШЧАМЯЛЁВА
г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.
Экспазіцыя:
■ **"Жыццёвы і творчы шлях народнага мастака Беларусі Леаніда Шчамялёва"**.
■ Выстава дзіцячага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва **"Цуд на Каляды!"** — да 21 студзеня.

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ МІХАІЛА САВІЦКАГА
г. Мінск, пл. Свабоды, 15.
Тэл.: 321 24 30.
Экспазіцыі:
■ **"Мастак. Грамадзянін. Герой"**. Прысвечана Ганароваму грамадзяніну г. Мінска Міхаілу Савіцкаму.
■ **"Мінск губернскі. Шляхецкі побыт"**.
■ Выстава жывапісу Сілвы Лінартэ (Латвія) **"Адлюстраванне"** — да 4 лютага.
■ Выстава **"Аголеная натура"** — да 20 студзеня.
■ Выстава **"Леў Барадулін. Легенда спартыўнай фатаграфіі"** — з 24 снежня да 25 лютага.

МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ РАТУША
г. Мінск, пл. Свабоды, 2а.
Тэл.: 321 24 30.
Экспазіцыя:
■ **"Мінск у гістарычнай прасторы. Картаграфічны кабінет"**.

МУЗЕЙ "ЛОШЫЦКАЯ СЯДЗІБА"
г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 8.
■ Пастаянная экспазіцыя.

ФЛІГЕЛЬ ЛОШЫЦКАГА СЯДЗІБНА-ПАРКАВАГА КОМПЛЕКСУ
г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 10.
Тэл.: 285 18 86.
Экспазіцыя:
■ **"Кола часу"** — прадметы гарадской і сялянскай культуры кан. XIX — сяр. XX стст.

ЭКСПАЗІЦЫЯ "КАРЭТНАЯ"
г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 8. Тэл.: 321 24 30.
■ **"Сані • вазок; каляска • брычка; карэта • вупраж"** (пастаянная экспазіцыя па гісторыі гужавога транспарту жыхароў Мінска XIX — пачатку XX стст.).
■ Віртуальная гульня **"Карэтны майстар"**.

ЭКСПАЗІЦЫЯ "МІНСКАЯ КОННАЯ ЧЫГУНКА"
г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 6.
■ Экспазіцыя складаецца з некалькіх раздзелаў, якія распавядаюць пра жыццё Мінска 1890 — 1920-х гг.

АРТ-ГАСЦЁЎНЯ "ВЫСОКАЕ МЬСТА"
г. Мінск, вул. Герцэна, 2а.
Тэл.: 321 24 30.
■ Выстава мастацкага тэкстылю і касцюма **"Гіперсувязі"** студэнтаў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў — да 25 лютага.

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ
г. Гомель, вул. Пушкіна, 5.
Тэл.: (8-0232) 77 57 41.
■ Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.
■ Пастаянная выстава тэхнікі на адкрытай пляцоўцы.
■ **"Музей крыміналістыкі"**.
■ Выстава **"Гомель і гамяльчане напярэдадні і ў гады Першай сусветнай вайны"** (выставачная зала).
■ Выстава **"Бітва матораў"** (хол музея).

ЛІДСКІ ГІСТОРЫКА-МАСТАЦКІ МУЗЕЙ
г. Ліда, вул. Перамогі, 37а.
Тэл.: (8-0154) 53 50 64.
Пастаянныя экспазіцыі:
■ **"Прырода Лідчыны"**.
■ **"Сучаснае мастацтва краю"** (жывапіс, графіка, скульптура, мастацкае шкло).
Выставы:
■ Выстава **"Майстэрня заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі, сябра Саюза мастакоў Беларусі Уладзіміра Мурахвера"**.
■ **"Вядзем пачатак мы ад Гедыміна..."**.
■ Мемарыяльны пакой **Валянціна Таўлая**.
■ Выстава са збору А.Фішбайна **"Рэчы побыту канца XIX — пачатку XX стст."**.
■ Музейна-вобразная зала **"Хрушчоўка 60-х"**.
■ Выстава **"Вайны свяшчэнныя старонкі"**.
■ Выстава **"Надзейны шчыт краіны"**.
■ Выстава **"Падарожжа ў гарадскі і сельскі побыт"**.
■ Выстава **"Жыве мая ліра нанова!"**

НАВАГРУДСКІ ГІСТОРЫКА-КРАЯЗНАЎЧЫ МУЗЕЙ
г.Навагрудак, вул. Гродзенская, 2. тэл. (8-01597) 2 14 70.
■ Пастаянная экспазіцыя: **"Гісторыя Навагрудчыны са старажытных часоў да Вялікай Айчыннай вайны"**.
г.Навагрудак, вул.Мінская, 64-66.
■ Экспазіцыя: **"Музей яўрэйскага супраціўлення ў Навагрудку"**.

ДОМ-МУЗЕЙ АДАМА МІЦКЕВІЧА Ў НАВАГРУДКУ
г. Навагрудак, вул. Леніна,1.
Тэл.: (8-01597) 2 43 40 (каса).
■ Пастаянная экспазіцыя: **"Жыццё і творчасць Адама Міцкевіча"**.
■ Пастаянныя выставы: **"Святло кухні Міцкевічаў"**, **"Малюнкі сельскага жыцця"**, **"Пан Тадэвуш" праз час і народы"**.

ГАЛЕРЭІ

"УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"
г. Мінск, пл. Кастрычніцкая, 1.
Тэл.: 327 26 12.
■ Фотавыстава Аляксандра Ласмінскага **"Сэрца зямлі маёй"** — да 30 студзеня.
■ Выстава керамікі беларускіх майстроў **"Між рукамі і полымем"** — з 25 снежня да 8 лютага.

ТЭАТРЫ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, пл. Парыжскай камуны, 1.
Тэл./факс: 334 11 56.
■ **20 — "Завея". Пушкін-Свірыдаў"** (літаратурна-музычная кампазіцыя). Камерная зала імя Л.П.Александроўскай). Пачатак у 19.30.
■ **21 — "Церам-Церамок"** (опера ў 2-х дзеях) І.Польскага. Пачатак аб 11-й.
■ **21 — "Дон Кіхот"** (балет у 3-х дзеях) Л.Мінкуса. У партыі Кітры — прыма-балерына Санкт-Пецярбургскага Тэатра Балета Канстанціна Тачкіна Ірына Калеснікава. Пачатак а 18-й.
■ **23 — "Царская нявеста"** (опера ў 3-х дзеях) М.Рымскага-Корсакава.
■ **24 — "Жар-птушка"** І.Стравінскага; **"Шахразада"** М.Рымскага-Корсакава. (балеты ў адной дзеі).
■ **24 — "Італьянскія фантазіі"** (канцэрт). Камерная зала імя Л.П.Александроўскай). Пачатак у 19.30.
■ **25 — "Чароўная флейта"** (опера ў 2-х дзеях) В.А.Моцарта.
■ **26 — "Маленькі прынц"** (балет у 2-х дзеях) Я.Глебава.
■ **27 — "Рэквіем"** Дж.Вердзі. Дырыжор — Амос Тальмон (Ізраіль).

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АКАДЭМІЧНЫ МУЗЫЧНЫ ТЭАТР
г. Мінск, вул. Мяснікова, 44.
Тэл.: 200 81 26.
■ **20 — "Шчаўкунок"** (балет у 2-х дзеях) П.Чайкоўскага. Пачатак аб 11-й.
■ **20 — "Лятучая мыш"** (аперэта ў 3-х дзеях) І.Штрауса. Пачатак а 18-й.
■ **21 — "Прыгоды брэменскіх музыкаў"** (мюзікл для дзяцей і дарослых у 2-х дзеях) Г.Гладкова. Пачатак аб 11-й.
■ **21 — "Таемны шлюб (Граф Люксембург)"** (аперэта ў 2-х дзеях) Ф.Легара. Пачатак а 18-й.
■ **22 — "Дуброўскі"** (мюзікл у 2-х дзеях) К.Брэйтбурга.
■ **23 — "Блакітная камея"** (мюзікл у 2-х дзеях) К.Брэйтбурга.
■ **24 — "Аднойчы ў Чыкага"** (музычнае рэвю ў 2-х дзеях) Дж.Стайна, Г.Мілера, Дж.Кандэра і інш.
■ **25 — "Тысяча і адна ноч"** (балет у 2-х дзеях) Ф.Амірава.
■ **26 — "Трыстан і Ізольда"** (фольк-рок-мюзікл у 2-х дзеях) А.Сімона. Прэм'ера.
■ **27 — "Спячая прыгажуня"** (балет у 2-х дзеях) П.Чайкоўскага. Прэм'ера. Пачатак аб 11-й.
■ **27 — "Містар Ікс"** (аперэта ў 2-х дзеях) І.Кальмана. Пачатак а 18-й.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ"
г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44.
Тэл./факс: 334 60 08.
■ **20 — "Гісторыя двух сабак"** (спектакль для дзяцей і дарослых) Я.Конева. Пачатак аб 11-й.
■ **21 — "Дажыць да прэм'еры"** (камедыя) М.Рудкоўскага.
■ **23 — "Гэта ўсё яна"** (драма) А.Іванова.
■ **24 — "Пелікан"** (ода злачыннай жарсці) А.Стрындберга.
■ **25 — "Пакуты ад здаровага сэнсу"** (камічная прыпавесць) С.Рубэ. Прэм'ера.
■ **27 — "Два чароўныя парасоны"** (казка для дзяцей і дарослых) Г.Х.Андэрсена. Пачатак аб 11-й.
■ **27 — "Адамавы жарты"** (камедыя) С.Навуменка.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"
г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2.
Тэл.: (8-0212) 36 32 50.
■ **21 — "Цудоўная скрыня з зялёным гарошкам"** (казачная гісторыя па матывах шведскіх казак у 2-х дзеях). Пачатак аб 11-й.
■ **27 — "Умка"** (кранальная гісторыя ў адной дзеі) Ю.Якаўлева. Пачатак аб 11-й.

УВАГА!
ТУТ МАГЛА БЫЦЬ ВАША АФІША!
Звяртайцеся:
+375 17 286 07 97,
+375 17 334 57 41 (факс)
kultura@tut.by